Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

16 ВЕРАСНЯ 2017 г. СУБОТА №179 (28543)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Юбілей вялікага барца

СТАР. 4



Вяртанне «Звязды» пасля вайны

СТАР. 11



Страх і нянавісць у М'янме

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У 1990 годзе ў сельскай гаспадарцы Беларусі было занята больш за мільён чалавек. Па факце мінулага года іх колькасць склала прыкладна 330 тысяч. Колькасць працуючых зменшылася ў 3,5 раза, пры гэтым вытворчасць збожжа, мяса, малака вырасла ў 2—2,7 раза. Эфектыўнасць работы сельгаспрадпрыемстваў вырасла ў 7 разоў. Такіх вынікаў удалося дабіцца шмат у чым дзякуючы развіццю прамысловай вытворчасці краіны».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9390 | ▼ |
| Еўра | 2,3112 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0337 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0739 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Святавольскія лесаводкі



**На вытворчых участках Калінінскага лясніцтва Івацэвіцкага раёна заўсёды вылучаюцца гэтыя дзве жанчыны — у працы засяроджаныя, адказныя, у час адпачынку — вясёлыя, жартаўлівыя. Памочнік ляснічага Святлана ПАЛЯЧОК і майстар лесу Тамара ШЫЛІК — прафесіяналы-лесаводы. Святлана *(на фота злева)* дваццаць шэсць гадоў таму скончыла Полацкі лясны тэхнікум і прыехала ў Святую Волю, — у гэтай вёсцы знаходзіцца кантора ўстановы. Святая Воля стала другой радзімай і для Тамары, якая ў свой час набыла прафесію ў Велікалуцкім лясным тэхнікуме ў Пскоўскай вобласці. Кіраўнік Калінінскага лясніцтва Мікалай Брычкалевіч з задавальненнем характарызуе сваіх падначаленых, кажа, што гэтыя жанчыны знайшлі сябе ў ляснай справе, сталі незаменнымі ў лясніцтве і, нягледзячы на не вельмі лёгкія ўмовы працы, застаюцца сапраўднымі жанчынамі.**

**На здымку: Святлана ПАЛЯЧОК і Тамара ШЫЛІК на праблемным участку хвойнага лесу, які трэба ратаваць ад вяршыннага караеда, абмяркоўваюць, якія меры неабходна распачаць у першую чаргу.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было слова

# УБАЧЫЦЬ ГУТЭНБЕРГА

## Унікальная кніга прыбыла ў Беларусь з Германіі

**Самае старажытнае, знакамітае і дарагое выданне Еўропы цяпер можна ўбачыць у Мінску.**

**У Беларусь з Германіі прыбыла Біблія Гутэнберга. Кніжны помнік, які сведчыць пра пачатак гісторыі кнігадрукавання ў Еўропе, да 31 снежня можна будзе ўбачыць на міжнароднай выстаўцы «Францыск Скарына і яго эпоха» ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Адкрыццё выстаўкі пачалося з урачыстай цырымоніі ўскладання кветак да помніка Францыску Скарыну. У ёй прынялі ўдзел старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі. З прывітальным словам да прысутных звярнуўся таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Петэр Дэтмар.

СТАР. 8

■ Ёсць рэзерв!

# АД ПЕРШЫХ КРОКАЎ — ДА ЗАЛАТЫХ МЕДАЛЁЎ

### Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па веславанні за дзесяцігоддзе стаў знакавым аб'ектам не толькі для сваіх відаў спорту, але і для горада

**Брастаўчане называюць яго па звычцы «вяслярным каналам». Цэнтр, які па міжнароднай кваліфікацыі адносіцца да аб'ектаў групы «А» па веславанні, стаў базай падрыхтоўкі многіх спартсменаў, а для пачаткоўцаў школай і трамплінам для спартыўных вышынь. Менавіта сёлета вяслярны канал адзначыў свой першы невялікі юбілей. Афіцыйнае адкрыццё аб'екта адбылося ў 2007 годзе.**

## Агляд гатоўнасці

**Дырэктар дзяржаўнай спецыялізаванай вучэбна-спартыўнай установы «Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па веславанні» Павел ДЗЕНІСЮК** называе самыя значныя спаборніцтвы, якія тут праводзіліся. Гэта найперш чэмпіянат Еўропы па акадэмічным веславанні сярод дарослых спартсменаў у 2009 годзе, праз год брэсцкі канал прыняў чэмпіянат свету сярод моладзі да 23 гадоў, так званы маладзёжны чэмпіянат. А сёлета Еўрапейская федэрацыя акадэмічнага веславання назвала Брэст месцам правядзення еўрапейскіх спаборніцтваў 2018 года сярод моладзі. Чэмпіянат прызначаны на верасень.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПАСЛАБЛЕННІ ДЛЯ БІЗНЕСУ І ПАДАТКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ

## Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра па падатках і зборах

**Учора кіраўнік дзяржавы правёў рабочую сустрэчу з міністрам па падатках і зборах Сяргеем Налівайкам. Яе тэма — два праекты ўказаў Прэзідэнта: «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб» і «Аб падатковым кансультаванні».**

Праект першага дакумента пашырае пералік відаў эканамічнай дзейнасці, якімі грамадзяне маюць права займацца без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Умова — уплата адзінага падатку. У пералік увіходзяць такія віды дзейнасці, як продаж самастойна прыгатаваных кулінарных вырабаў, прадастаўленне месцаў для кароткатэрміновага пражывання фізічных асоб, выкананне па заказах спажыўцоў работ па рамонце мэблі, гадзіннікаў, абутку, пашыве адзення, распілоўцы дроў, пагрузцы грузаў і іншае. Пры гэтым пералік будзе пашырацца.

Другі дакумент — «Аб падатковым кансультаванні» — выклікаў пытанні ў кіраўніка краіны:

— Хацелася б, каб вы асаблівую ўвагу звярнулі на экспертызу карупцыйнасці гэтага закона. Што мяне насцярожвае: у нас ёсць падатковая інспекцыя, якая так ці інакш нешта падказвае, кансультуе, калі некаму незразумела... Каб мы не легалізавалі платную дзейнасць вашых падначаленых: яны будуць браць грошы, а пасля забудуць, што яны — людзі дзяржаўныя. Трэба на дзяржаву працаваць, а яны пойдуць за грошы кансультаваць, а яшчэ і прасоўваць некага. І мы гэтым самым легалізуем жульніцкую дзейнасць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### ❍ У ТЭМУ:

**Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах**, расказаў пасля сустрэчы з кіраўніком дзяржавы, што абодва праекты дакументаў падтрыманы. Што да праекта ўказа, прысвечанага падатковаму кансультаванню, то міністр заявіў:

— Прадугледжана, што на першапачатковым этапе метадалагічнае суправаджэнне падатковых кансультантаў будзе сапраўды здзяйсняць Міністэрства па падатках і зборах. У перспектыве гэта функцыя пяройдзе да палаты падатковых кансультантаў. Стаць падатковым кансультантам зможа не абавязкова эканаміст. Гэта можа быць і юрыст, і дзеючы бухгалтар, адвакат, таму мы не кажам пра тое, што будзе ўведзена новая спецыяльнасць у ВНУ.

# Не радавая падзея

**У Палацы Незалежнасці адбыўся прыём, прысвечаны 20-годдзю каманды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сабраліся людзі, якія зрабілі значны ўнёсак у яе развіццё.**

Гульцы прыйшлі са сваімі блізкімі людзьмі, для іх была арганізавана экскурсія па Палацы. Трэба сказаць, што, відаць, найбольш цікавай яе часткай стала імправізаваная выстаўка да юбілею каманды. На ёй прадстаўлены самыя розныя здымкі, якія належаць і да 1990-х, і да 2000-х, і да цяперашняга часу. Удзельнікі прыёму пабывалі ў розных залах славутага на ўсю краіну і нават на ўвесь свет будынка — ад залы ўрачыстых цырымоній да зялёнай, чырвонай, камінной залы. Пасля экскурсіі ўсіх чакала цырымонія фатаграфавання з лідарам каманды — Аляксандрам Лукашэнкам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ГАНДЛЯВАЦЬ У ВЁСЦЫ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

## Прэзідэнт сустрэўся з міністрам антыманапольнага рэгулявання і гандлю

**На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з бізнесменам Паўлам Тапузідзісам, асноўнай тэмай іх размовы было павышэнне якасці жыцця людзей, што жывуць у сельскай мясцовасці. Учора кіраўнік дзяржавы зноў звярнуўся да гэтай задачы, калі прымаў з дакладам міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзіміра КАЛТОВІЧА.**

Абмяркоўвалі праект указа Прэзідэнта «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання», які ўнесены на разгляд кіраўніка дзяржавы. Падрыхтоўкай дакумента займалася ведамства Уладзіміра Калтовіча. Праект указа накіраваны на развіццё гандлю, грамадскага харчавання, бытавых паслуг у першую чаргу ў сельскай мясцовасці і малых гарадах.

На працягу апошніх гадоў назіраецца скарачэнне колькасці магазінаў у сельскіх населеных пунктах. Толькі з 2012 па 2015 гады іх зменшылася на 10% — з 9893 да 8977 адзінак. У выніку там, дзе некалькі гадоў таму былі прыдарожныя крамы або іншыя аб'екты бытавога абслугоўвання, засталіся пустуючыя будынкі. Для выпраўлення сітуацыі праектам дакумента абласныя Саветы дэпутатаў на пяць гадоў — з 1 студзеня 2018-га па 1 студзеня 2022 года — надзяляюцца правам на прадастаўленне шэрагу падатковых і іншых льгот суб'ектам гаспадарання, што здзяйсняюць названыя віды дзейнасці на тэрыторыі сельскай мясцовасці і ў малых гарадах.

— Адпаведны праект указа прыйдзецца яшчэ раз прааналізаваць і далажыць для прыняцця рашэння: прымальны ён, непрымальны, і гэтак далей, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Гандаль, грамадскае харчаванне, бытавыя паслугі вельмі важныя перш за ўсё ў малых гарадах і на сяле. Нікому не трэба гэта тлумачыць. Меры, якія мы будзем прымаць, павінны быць звернуты перш за ўсё на гэты сектар аказання паслуг.

Даручэнне Прэзідэнта — зняць бар'еры, што замаруджваюць развіццё бізнесу ў малых гарадах і ў сельскай мясцовасці.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра сваё ранейшае патрабаванне — паздымаць перашкоды, якія тармозяць развіццё сферы і перашкаджаюць працаваць:

— Тыпу, колькі халадзільнікаў мець, дзе мыць посуд, куды ісці, што і як несці... Трэба рабіць гэта проста, але — з санітарнага пункту гледжання, арганізацыйных нейкіх мер усё павінна быць цалкам зразумела для людзей і бяспечна, вось уся канцэпцыя. Таму, калі ласка, дакладвайце па гэтым праекце ўказа: што змянілася пасля абмеркавання, як вы яго дапрацоўвалі ці вы лічыце непатрэбным яго дапрацоўваць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### ❍ У ТЭМУ:

**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю**, расказаў журналістам, што кіраўнік дзяржавы ўхваліў тыя падыходы, якія прапануе праект указа:

*— Пры гэтым было адзначана, што ўся адказнасць за арганізацыю работы па выкананні ўказа ляжыць на нашым міністэрстве. Сапраўды, мы бачым сваю задачу ў папулярызацыі ідэй гэтага ўказа ў рабоце з гандлёвымі сеткамі, з індывідуальнымі прадпрымальнікамі. У найбліжэйшы час мы арганізуем такую работу ў абласцях. Сутнасць гэтага ўказа ў тым, што прапануецца асаблівы прэферэнцыяльны рэжым на тэрыторыях у мэтах забеспячэння гарантаванага годнага абслугоўвання насельніцтва па цане, якасці і асартыменце.*

■ Захад-2017

# ЗНАЙСЦІ І ЗНІШЧЫЦЬ УМОЎНАГА ПРАЦІЎНІКА

## Сёння рэгіянальная групоўка войскаў завяршае выкананне вучэбна-баявых задач першага этапу вучэння

**На фінальнай стадыі — падрыхтоўка войскаў (сіл) да баявога прымянення па ізаляцыі раёнаў дзеянняў незаконных узброеных фарміраванняў і дыверсійна-разведвальных груп умоўнага праціўніка. Акрамя таго, плануецца завяршыць падрыхтоўку да адбівання магчымай агрэсіі, адпрацаваць пытанні арганізацыі ўзаемадзеяння і ўсебаковага забеспячэння. Пры гэтым для прыкрыцця важных дзяржаўных і ваенных аб'ектаў адбываецца нарошчванне групоўкі ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны.**

Перш чым вайскоўцы прыступілі да выканання вучэбна-баявых задач вучэння, яго кіраўніцтва ацаніла абстаноўку. У першы ж дзень вучэння на палігоне Лепельскі пачаўся практычны розыгрыш баявых і спецыяльных дзеянняў па пошуку, блакіраванні і знішчэнні дыверсійна-разведвальных груп і незаконных узброеных фарміраванняў.

А тым часам на палігоне Даманава, што на Брэстчыне, вайскоўцы неслі баявое дзяжурства па проціпаветранай абароне, ахове і абароне пазіцый, якія перад гэтым былі абсталяваны па апошніх тэндэнцыях вайсковай інжынерыі. На палігоне Ружанскі ўдзельнікі манеўраў з дапамогай авіяцыі спынілі ўмоўнае парушэнне дзяржаўнай мяжы ў паветранай прасторы, а пад Барысавам непасрэдна рыхталіся да баявых дзеянняў.

Пытанні арганізацыі тэрытарыяльнай абароны — нясенне службы, патруляванне падраздзяленнямі тэрытарыяльных войскаў сумесна з прадстаўнікамі ўнутраных войскаў, ахова і абарона важных аб'ектаў, а таксама ўмоўная барацьба з дыверсійна-разведвальнымі групамі і незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі — адпрацоўваліся ў Глыбоцкім раёне. Дзеля гэтых мэт, у адпаведнасці з планам ваенных збораў, сёлета для ўдзелу ў вучэнні прызвана каля 470 ваеннаабавязаных.

Падчас другога дня манеўраў была праверана зладжанасць органа кіравання рэгіянальнай групоўкі войскаў. Дарэчы, у склад Аб'яднанага камандавання ўваходзяць афіцэры цэнтральных органаў ваеннага кіравання Узброеных сіл Беларусі і Расіі, штаба Заходняй ваеннай акругі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Была ацэнена эфектыўнасць сістэмы кіравання групоўкі, практычныя навыкі афіцэраў падчас кіравання баявымі дзеяннямі, якасць адпрацоўкі дакументаў, іх адпаведнасць створанай абстаноўцы з улікам змены спосабаў вядзення ваенных дзеянняў у сучасных умовах.

Пакуль у штабах усіх узроўняў адпрацоўваліся пытанні кіравання падначаленымі сіламі і сродкамі пры вядзенні імі спецыяльных і засадных дзеянняў, падтрыманні рэжыму ваеннага становішча, злучэнні і вайсковыя часці ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны знаходзіліся на баявым дзяжурстве. Экіпажы беларускіх і расійскіх самалётаў спынілі дастаўку лёгкаматорнай авіяцыяй зброі і боепрыпасаў у раёны дзеянняў незаконных узброеных фарміраванняў. Прычым ажыццяўлялі пастаўленую задачу авіятары са становішча дзяжурства на аэрадроме, а таксама з зоны дзяжурства ў паветры. А тым часам іх калегі на верталётах Мі-8 і Мі-24 ажыццявілі пошук і знішчэнне дыверсійна-разведвальных груп умоўнага праціўніка, а таксама незаконных узброеных фарміраванняў на ўчастку мясцовасці Дрэтунь.

### Даслоўна

**Начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі Уладзімір МАКАРАЎ:**

*— Усе падраздзяленні расійскага складніка рэгіянальнай групоўкі войскаў, якія ўдзельнічаюць у сумесным стратэгічным вучэнні «Захад-2017», прыбылі на тэрыторыю Беларусі ў адпаведнасці з усталяваным парадкам. Яны знаходзяцца на палігонах, прыступілі да адпрацоўкі вучэбных пытанняў. Прыбыццё ў нашу краіну іншых падраздзяленняў з Расійскай Федэрацыі з мэтай удзелу ў вучэнні не прадугледжана. У той жа час іншых вучэнняў на тэрыторыі Беларусі, акрамя як «Захад-2017», таксама не плануецца. Што датычыцца адпрацоўкі пытанняў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, то гэта адбываецца без перагрупоўкі войскаў на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь.*

На пошук і знішчэнне ўмоўнага праціўніка былі накіраваны і дзеянні дэсантна-штурмавых і разведвальных падраздзяленняў 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады. Апошнія паспяхова знайшлі і тайнікі з запасамі матэрыяльных сродкаў ворага. У барацьбе з дыверсійна-разведвальнымі групамі ўмоўнага праціўніка, а таксама незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі задзейнічаны ў Глыбоцкім раёне і войскі тэрытарыяльнай абароны. Падраздзяленні ж сіл спецыяльных аперацый адпрацавалі пастаўленыя задачы па ўзмацненні аховы ўчастка дзяржаўнай мяжы, правялі спецыяльныя дзеянні ў раёнах адказнасці.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пры тэракце ў лонданскім метро была выкарыстана самаробная бомба




Выбух на станцыі лонданскага метро «Парсанс грын» быў ажыццёўлены з дапамогай самаробнага выбуховага прыстасавання, паведаміў кіраўнік контртэрарыстычнага падраздзялення Скотланд-Ярда Марк Роўлі. Ён заклікаў лонданцаў, якія сталі сведкамі інцыдэнту, дапамагчы расследаванню і паведаміць усё, што ім вядома. Выбух на станцыі метро адбыўся ў час пік на станцыі «Парсанс грын» на захадзе Лондана. Парсанс грын — спальны раён, дзе жыве шмат замежнікаў, студэнтаў і небагатых брытанцаў.

### Генеральны сакратар ААН асудзіў новы ракетны пуск у КНДР

Антоніу Гутэрыш заклікае Пхеньян спыніць такія выпрабаванні, заявіў афіцыйны прадстаўнік кіраўніка арганізацыі Стэфан Дзюжарык. «Генеральны сакратар асуджае запуск Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікай (КНДР) яшчэ адной балістычнай ракеты. Гэта відавочнае парушэнне рэзалюцый Савета Бяспекі адбылося ўсяго праз некалькі дзён пасля таго, як КНДР ажыццявіла шостае ядзернае выпрабаванне», — адзначаецца ў заяве. Па словах Дзюжарыка, генеральны сакратар ААН мае намер абмеркаваць сітуацыю на Карэйскім паўвостраве з усімі зацікаўленымі бакамі «на палях» пасяджэння высокага ўзроўню Генасамблеі ААН, якое мае адбыцца на наступным тыдні.

### У афшорах схавана 60% расійскага ВУП

У афшора сканцэнтравана 8% фінансаў усяго насельніцтва Зямлі. Гэта 10% сусветнага ВУП, або 5,6 трлн долараў (па курсе 2007 года, узятага ў якасці кропкі адліку). Пры гэтым расіяне трымаюць у афшорах актывы на суму, якая складае 60% ВУП. Гэта амаль 60 трлн рублёў, або больш за 1 трлн долараў (у пераліку па бягучым курсе), піша газета «Коммерсант» са спасылкай на звесткі амерыканскай некамерцыйнай арганізацыі «Нацыянальнае бюро эканамічных даследаванняў» (NBER). Як выявілі аўтары апублікаванага NBER даследавання «Хто валодае багаццем у падатковых гаванях?», радзей за ўсё хаваюць свае грошы жыхары скандынаўскіх дзяржаў — там доля афшора не перавышае 2% ВУП.

### У ЗША ўручылі Шнобелеўскую прэмію

У ЗША адбылася 27-я цырымонія ўручэння Шнобелеўскай прэміі — міжнароднай узнагароды за даследаванні сумніўнай навуковай каштоўнасці. Мерапрыемства зноў прайшло ў Гарвардскім універсітэце. Прэмію па фізіцы




ўганараваўся Марк-Антуан Фардзін, які даказаў, што кошкі — гэта вадкасць. «У вадкім стане рэчыва займае пэўны аб'ём і прымае форму ёмістасці, у якой знаходзіцца», — тлумачыць вучоны ў сваім даследаванні «Аб рэалогіі кошак».

■ Парламенцкі дзённік

# Экалогія без межаў

Кітайская дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Камісіі па заканадаўчых пытаннях Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Сюй Аньбаа наведвае нашу краіну. Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяны КАНАНЧУК**, адна з галоўных задач дэлегацыі КНР — пазнаёміцца з заканадаўствам Беларусі ў сферы прыродаахоўнай тэматыкі, забеспячэння радыяцыйнай бяспекі і пераадолення наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

«Іх цікавіць, якім чынам удасканальваецца экалагічнае заканадаўства ў нашай краіне. Мы таксама падрыхтавалі для наведвання нашых калег аб'екты, каб паказаць прымяненне заканадаўства на практыцы», — расказала яна. Акрамя таго, на сустрэчы дэлегацыі ў Доме ўрада з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляславам Пірштуком віцэ-спікер падкрэсліў, што двухбаковыя адносіны маюць высокую дынаміку і шматвектарнасць. «Нашы адносіны з'яўляюцца стратэгічнымі, і Кітай для нас — адзін з асноўных партнёраў. Вельмі шмат праектаў крэдытуецца ў розных галінах эканомікі. Беларусь мае дастаткова салідны вопыт партнёрскай работы з кітайскімі кампаніямі», — растлумачыў Баляслаў Пірштук.

Сюй Аньбаа ў сваім прывітальным слове пагадзіўся з віцэ-спікерам і дадаў, што цяперашні візіт кітайскай дэлегацыі дае магчымасць дзвюм краінам яшчэ і абмяняцца вопытам, у тым ліку заканадаўчым, у сферы экалогіі і аховы навакольнага асяроддзя, асабліва з улікам таго, што экалагічная праблема досыць востра стаіць перад Кітаем.

Дэлегацыя з КНР наведвае Беларусь з 14 па 17 верасня. У планах гасцей наведаць Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук па біярэсурсах, Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А.Д. Сахарава і шэраг айчынных прадпрыемстваў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Форум

# Эканамічныя перадумовы для інвестараў

**Беларусь зацікаўлена ў канструктыўным дыялогу з міжнародный бізнес-супольнасцю, заявіў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ на сустрэчы з актывам Міжнароднага кангрэса прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.**

Паводле слоў прэм'ер-міністра, нягледзячы на ўсе цяжкасці, унутраныя і знешнія праблемы, у Беларусі забяспечваецца макраэканамічная збалансаванасць, устойлівасць на фінансавым і валютным рынках. Значна палепшылася сітуацыя на крэдытна-дэпазітным рынку. Стаўкі па крэдытах для рэальнага сектара эканомікі істотна зніжаны. Стабільны валютны і цэнавы фон далі магчымасць толькі ў 2017 годзе на 8,2% знізіць цану запазычанасці для рэальнага сектара.

Забяспечваецца знешнегандлёвы баланс. Сальда гандлю таварамі і паслугамі за студзень — ліпень сёлета склалася станоўчым для Беларусі ў памеры 490 млн долараў. Зніжэнне ўплыву манетарных фактараў дазволіла выйсці на мінімальны за апошніе дзесяцігоддзе прырост інфляцыі. Паляпшаюцца і агульныя фінансавыя паказчыкі работы эканомікі. Разам з тым ёсць і праблемы, якія паэтапна вырашаюцца, канстатаваў кіраўнік урада. Як і любая іншая краіна, Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з міжнароднымі карпарацыямі.

«Ва ўмовах велізарнай канкурэнцыі, а лепш сказаць — жорсткай барацьбы за інвестыцыі і тэхналогіі, Беларусь пастаянна працуе над паляпшэннем інвестклімату і ўмоў для стварэння і функцыянавання вытворчасцяў. У нас дзейнічае прасунутае інвестыцыйнае заканадаўства з рознымі прэферэнцыйнымі рэжымамі», — звярнуў увагу прэм'ер-міністр. Гэта стварае эканамічныя перадумовы для прыцягнення інвестараў і размяшчэння імі свайго бізнесу, асабліва ў малых і сярэдніх гарадах і сельскай мясцовасці, у свабодных эканамічных зонах, Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», Парку высокіх тэхналогій. Індустрыяльны парк «Вялікі камень» арыентаваны на развіццё высокатэхналагічнай прамысловасці, лагістыкі, стварэнне навукаёмістых вытворчасцяў. Парк высокіх тэхналогій з'яўляецца адным з найбуйнейшых ІТ-кластараў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

Андрэй Кабякоў адзначыў, што кампаніі-рэзідэнты вызваляюцца ад усіх карпарацыйных падаткаў, уключаючы ПДВ і падатак на прыбытак. У нашай краіне функцыянуюць шэсць свабодных эканамічных зон са спецыяльным мытным, рэгістрацыйным і падатковым рэжымамі. «Усе прапанаваныя на выбар інвестару рэжымы і тэрыторыі маюць сур'ёзныя падатковыя, мытныя і іншыя прэферэнцыі пры гарантаванай дзяржавай абароне інвестыцый», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Андрэй Кабякоў таксама нагадаў, што ўрад працуе над стварэннем максімальна спрыяльных умоў для фарміравання і функцыянавання прадпрымальніцкага асяроддзя.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# КАНФЛІКТ ІНТАРЭСАЎ

## Менавіта з гэтай прычыны часта прыходзяць на прыём да высокапастаўленага чыноўніка людзі

**Вось і падчас сустрэчы памочніка Прэзідэнта Беларусі — інспектара па Гомельскай вобласці Юрыя ШУЛЕЙКІ з грамадзянамі, якая прайшла ў Калінкавічах, людзі часта скардзіліся не на ўлады, а прасілі быць трацейскім суддзёй у сітуацыях, якія вырашыць самім не ўдалося.**



Адна сітуацыя: група людзей на чале са старшынёй кааператыва «Парус-1» Пятром Краўчанкам выступае за тое, каб пусціць аўтобус да садовага таварыства. Нават дарогу і прыпыначны пункт для гэтага зрабілі. Іншыя грамадзяне — супраць. Другая сітуацыя: Рыгор Дрынеўскі патрабуе, каб быў адкрыты рух па вуліцы Чкалава ў Калінкавічах. Жыхарам, якія на ёй жывуць, такая прапанова зусім не падабаецца. Хто больш мае рацыю?

У кожнай сітуацыі чыноўнік разбіраецца з дапамогай асоб, адказных за тыя ці іншыя пытанні, выслухоўвае ўсе аргументы «за» і «супраць». Аднолькавых рашэнняў тут быць не можа. І таму першае з азначаных пытанняў практычна адразу вырашаецца на карысць працягу аўтобуснага маршруту. Па другім яшчэ будзе вывучацца сітуацыя і ў вызначаны тэрмін рыхтавацца абгрунтаваны адказ.

Зразумела, некаторыя праблемы накшталт правядзення капітальных рамонтаў патрабуюць значнага часу. Дарэчы, чыноўнікі на месцах, калі атрымліваюць скаргу, імкнуцца хоць бы пачаць вырашаць праблему практычна пасля таго, як яна агучана заяўнікам. І гэта, лічыць Юрый Шулейка, таксама станоўчы вынік прыёмаў, якія ладзяцца па ўсёй краіне:

— Няма падстаў зусім не давяраць органам мясцовай улады, — падводзіць вынікі чарговай сустрэчы з людзьмі Юрый Шулейка. — Многія пытанні мясцовыя ўлады імкнуцца вырашыць непасрэдна перад прыездам чыноўніка. Часам і за дзень да прыезду вырашаюць. Таму можна сказаць, што работа са зваротамі ідзе дастаткова. Традыцыйныя пытанні ёсць. Яны датычацца эксплуатацыі жылых памяшканняў. Таксама шмат пытанняў аб перадзеле зямельных участкаў. Часта людзі не задаволены рашэннямі судоў і хочуць дабіцца іх адмены ці перагляду. Аднак умяшанне ў дзейнасць судоў супярэчыць заканадаўству. Тым больш калі рашэнне прайшло праз вышэйшыя інстанцыі.

Апошні каментарый датычыцца зямельнага пытання, якое эмацыянальна агучыла пенсіянерка Наталля Старавойтава. Афіцыйна яна самавольна захапіла частку суседскага ўчастка, вось толькі сваёй віны не прызнае, нягледзячы на судовае рашэнне.

Усяго на прыёме Юрыя Шулейкі ў Калінкавічах пабывала сем чалавек. Па кожным пытанні памочнік Прэзідэнта даў тлумачэнні, некаторыя ўзяў пад асабісты кантроль і даў распараджэнні адпаведным службам райвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

### Тым часам

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. З 18 па 22 верасня 2017 года прыёмы пройдуць у Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай абласцях па наступным графіку:**

**18 верасня** з 10 да 13 гадзін у Магілёўскім аблвыканкаме прыём будзе весці ЛАЎРАНКОЎ Генадзь Міхайлавіч, памочнік Прэзідэнта — інспектар па **Магілёўскай вобласці**.

**19 верасня ў Мёрскім райвыканкаме** з 11 да 14 гадзін прыём правядзе ПОБАЛЬ Крысціна Габрыілаўна, першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў.

**21 верасня ў Жыткавіцкім райвыканкаме** з 11 да 14 гадзін прыём будзе праводзіць РЫЖАНКОЎ Максім Уладзіміравіч, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, а ў Пружанскім райвыканкаме з 10 да 13 гадзін будзе працаваць на прыёме начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі КРЫВАШЭЕЎ Юрый Васілевіч.

**22 верасня** патрапіць на прыём да першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максіма Уладзіміравіча РЫЖАНКОВА можна будзе ў Петрыкаўскім райвыканкаме з 9 да 12 гадзін, а МАТЭЛЬСКІ Андрэй Францавіч, начальнік галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення, у гэты ж дзень правядзе прыём у **Глыбоцкім райвыканкаме** з 10 да 13 гадзін.

***Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб адпаведных выканаўчых камітэтаў.***

■ Я зноў выбіраю «Звязду»:

# Без залішняй публічнай рыторыкі

**Эла ЯКУБОЎСКАЯ, настаўнік фізікі жодзінскай гімназіі №1, настаўнік-метадыст:**



Фота Надзеі БУЖАН.

Са «Звяздой» я знаёмая ўжо многа гадоў, і хачу адзначыць, што яна заўсёды для мяне цікавая і актуальная! Па-першае, усе падзеі, што адбываюцца ў нашай краіне, абавязкова знаходзяць адлюстраванне на яе старонках, прычым на беларускай мове, што для мяне надзвычай важна.

Па-другое, у нашай сям'і два педагогі (я і муж), і мы як людзі, што працуюць у школе, вельмі любім чытаць пра сваіх калег, даведвацца пра іх думкі па тых ці іншых актуальных пытаннях, якія сёння ва ўсіх на слыху: ад падыходаў да ацэньвання дасягненняў вучняў — да атэстацыі педагогаў. І, што нам імпануе, «Звязда» не спрабуе штосьці завуаліраваць, а называе рэчы сваімі імёнамі, калі ёсць праблема — значыць, яе трэба абмяркоўваць, нават калі пазіцыя педагогаў і не супадае з афіцыйнай.

Некалькі гадоў таму я была дэлегатам III з'езда настаўнікаў СНД, які праходзіў у Мінску. Усіх удзельнікаў з'езду зачапіла выступленне міністра адукацыі і навукі Арменіі Армэна Ашацяна, памятаю, што зала яму доўга апладзіравала. Але адна справа — паслухаць, а іншая — паўтарыць пачутае. Пачалі з калегамі шукаць артыкулы са з'езда ў СМІ, і высветлілася, што толькі «Звязда» працытавала яго даслоўна: *«Настаўнік не з'яўляецца героем дня, па-мойму, ні ў адной з былых постсавецкіх рэспублік. Ствараецца ўражанне, што ў нашых краінах адукацыя ператварылася ў "свяшчэнную карову", на якую зрэдку моляцца, дрэнна яе кормяць, але кожны імкнецца надаіць паболей. Існуе бездань паміж дэкларыванай каштоўнасцю адукацыі і стаўленнем да яе з боку грамадства і ўрада. Для ўрада адукацыя — адна з важных сацыяльных сфер, дзе трэба рабіць папуліцкія заявы і падкрэсліваць яе важнасць для развіцця дзяржавы. Як правіла, недахоп фінансавання кампенсуецца празмернай публічнай рыторыкай»*. Мы з калегамі гэтыя вельмі трапныя словы занатавалі і пастаянна да іх звяртаемся.

Увогуле, самыя аператыўныя рэпартажы з важных педагагічных форумаў, апошнія звесткі падчас уступнай кампаніі, абмеркаванне законапраектаў я шукаю менавіта на старонках маёй «Звязды».

**Запісала Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Бяспека

# За суткі ратавальнікі знайшлі 13 грыбнікоў

**У Магілёўскай вобласці згубіліся чацвёра, а ў Віцебскай — адразу дзявяцера грыбнікоў, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.**

У Магілёўскай вобласці ў 16.40 паступіла паведамленне аб прапаўшай у лясным масіве каля вёскі Вішнёўка 54-гадовай жанчыне. А ў 19.30 прыйшлі аналагічныя звесткі пра трох грыбнікоў, якія згубіліся ў лясным масіве каля вёскі Боркі-1. У пошукавых работах былі задзейнічаныя супрацоўнікі міліцыі і работнікі МНС. У 17.30 ратавальнікі знайшлі жанчыну, а ў 21.30 — трох іншых грыбнікоў.

Больш за ўсё заблукаўшых было ў Віцебскай вобласці. У 17.00 ратавальнікам паведамілі пра двух грамадзян, якія прапалі ў лясным масіве каля вёскі Кабішча Гарадоцкага раёна. Сувязь з 65-гадовым мужчынам і з яго 54-гадовай жонкай падтрымлівалася па тэлефоне. У 21.30 яны былі знойдзеныя.

У 19.40 аршанскім ратавальнікам стала вядома пра дзвюх жанчын і мужчыну, якія зніклі ў лесе каля вёскі Светачоўка. На пошукі выехалі ратавальнікі і супрацоўнікі РАУС. У 20.57 грыбнікі выйшлі на гукавую сірэну і светлавыя сігналы работнікаў МНС.

Да цямры блукалі грыбнікі ў Дубровенскім раёне. У 20.27 паступіла паведамленне пра зніклых каля вёскі Кіраёва трох пенсіянерак. А ў 21.20 аналагічная інфармацыя прыйшла з вёскі Анціпенкі, у лесе каля якой заблукаў 70-гадовы мужчына. У 22.02 тры жанчыны выйшлі з лесу на сірэну ратавальнікаў, а ў 22.17 на святло і гук аўтацыстэрны — зніклы мужчына. Ва ўсіх выпадках дапамога медыкаў грыбнікам не спатрэбілася.

Акрамя таго, на Магілёўшчыне працягваюцца пошукі мінчанкі 1963 года нараджэння і 53-гадовага мужчыны, якія сышоў у лес у грыбы на Віцебшчыне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# Найлепшы барэц XX стагоддзя адзначае юбілей



## Сёння Аляксандру МЯДЗВЕДЗЮ спаўняецца 80 гадоў

**Ён нарадзіўся ва ўкраінскай вёсцы Белая Царква ў сям'і лесніка. У юнацкім узросце вызначаўся выдатнымі антрапаметрычнымі данымі — рост 190 см, вага больш за 90 кг, таму спрабаваў сябе ў розных відах спорту, але сярод валейбола, баскетбола, лёгкай атлетыкі і нават гімнастыкі абраў барацьбу. Яго сур'ёзная спартыўная кар'ера пачалася ў войску, а потым хутка пра Аляксандра Мядзведзя даведаўся і ўвесь свет.**

У 1961 годзе ён стаў найлепшым сярод вольных барцоў у цяжкай вазе ў СССР, а праз тры гады выйграў свой першы залаты алімпійскі медаль. Найлепшым Мядзведзь стаў і на наступных Алімпійскіх гульнях у Мехіка, а вось на трэція ў кар'еры Гульні ў Мюнхене Аляксандр Васілевіч адпраўляўся ўжо ў 35-гадовым узросце і напэўна разумеў, што яны стануць для яго апошнімі.

У вырашальным паядынку Мядзведзь сустрэўся з даўнім сваім сапернікам — балгарынам Асманам Дураліевым. Ён таксама хацеў пакінуць спорт пасля гэтай Алімпіяды, пайсці, адабраўшы ў Мядзведзя «золата». Неверагодны па напружанні паядынак скончыўся пераканаўчай перамогай савецкага барца. Мядзведзь пакланіўся ва ўсе бакі гледачам, выйшаў на сярэдзіну дывана, упаў на калені і пацалаваў яго... Увесь спартыўны свет таго часу запомніў гэтую карціну. Зала ўстала і абрынула на трохразовага алімпійскага чэмпіёна гром апладысментаў. Так, непераможным, Мядзведзь развітаўся з вялікім спортам.

**Прэзідэнт Беларусі, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 80-годдзем трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя.**

**«На працягу ўсёй працоўнай дзейнасці Вы былі цесна звязаны са спортам вышэйшых дасягненняў і ўнеслі вялікі ўклад у развіццё вольнай барацьбы, праславілі нашу Радзіму на міжнароднай арэне, стаўшы трохразовым алімпійскім чэмпіёнам», — гаворыцца ў віншаванні.**

**Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што легендарныя перамогі спартсмена вядомыя ва ўсіх кутках свету. «Сёння Вы дзеліцеся сваімі ведамі і багатым вопытам з падрастаючым пакаленнем атлетаў, актыўна спрыяючы развіццю алімпійскага руху ў Беларусі», — адзначыў Прэзідэнт.**

Пра трываласць і сілу волі Аляксандра Васілевіча хадзілі легенды, балельшчыкі захапляліся неверагодна ўчэпістымі і спрытнымі рукамі Мядзведзя. Паядынкі з яго ўдзелам любілі не толькі гледачы, але і суддзі, таму што тэхніка савецкага барца была вельмі разнастайнай, публіка з замiраннем сэрца назірала, як ён спраўляецца з барцамі, большымі за сябе па масе і аб'ёме.

Акрамя мноства спартыўных узнагарод, Аляксандр Васілевіч атрымаў прыз «За высакароднасць у спорце», заснаваны ЮНЕСКА. Ён прызнаны найлепшым барцом вольнага стылю ў гісторыі спорту і ўведзены ў залу спартыўнай славы барацьбы.

У Мінску з нагоды юбілею легендарнага барца пройдзе шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку турнір імя Аляксандра Мядзведзя, які даўно стаў традыцыйным і праводзіцца ў сталіцы ўжо 47 гадоў. Сёлета ў спаборніцтвах прымаюць удзел каля 300 спартсменаў з 15 краін. Наймацнейшыя барцоўскія дзяржавы прывезлі ў Мінск самых лепшых сваіх прадстаўнікоў. Турнір праходзіць у сталічным Палацы спорту. Акрамя таго, сёння ў мінскай ратушы пройдзе ўрачыстая цырымонія ўшанавання юбіляра з уручэннем яму медаля Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі «За выдатныя заслугі» і ганаровай узнагароды Міжнароднага алімпійскага камітэта.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

### Дасягненні

**Аляксандр Мядзведзь — алімпійскі чэмпіён па вольнай барацьбе (у 1964-м — у паўцяжкай вазе, у 1968 і 1972 гадах — у цяжкай вазе). Чэмпіён свету 1962—1963, 1966—1967, 1969—1971 гадоў. Чэмпіён Еўропы 1966, 1968, 1972 гадоў. Чэмпіён СССР 1961—1963, 1966—1970 гадоў.**



Алімпіяда-1972. Мюнхен. Паядынак Аляксандра МЯДЗВЕДЗЯ і амерыканскага барца Крыса ТЭЙЛАРА.

# ...ДА ЗАЛАТЫХ МЕДАЛЁЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Чакаецца прыкладна тры дзясяткі краін-удзельніц, прыедзе каля 700 чалавек. Даволі прадстаўнічае і значнае спаборніцтва брастаўчане маюць намер правесці на належным узроўні. Ужо ў кастрычніку, менш чым праз месяц, адбудзецца так званы передэўрапейскі прагон, спаборніцтва пад назвай «Кубак Балтыкі». «Нам далі такую рэгату з удзелам спартсменаў з Даніі, Латвіі, Эстоніі, Літвы, каб у тым ліку праверыць нашу гатоўнасць да гульняў будучага года, — гаворыць Павел Дзенісюк. — У Брэст прыедуць міжнародныя суддзі. І мы гатовыя сустракаць любых экспертаў. Усё абсталяванне сертыфікаванае. Усе неабходныя замеры праведзеныя. Ну і разлічваем таксама на запоўненыя трыбуны». Так было на ранейшых вялікіх турнірах, на гэта спадзяюцца арганізатары і еўрапейскіх спаборніцтваў будучага года.

## ПОШУК ТАЛЕНТАЎ, ЗОРКІ І ЗОРАЧКІ

Усё астатняе, як вядома, за спартсменамі. Іх справа — паказаць цікавае веславанне. Менавіта для іх, спартсменаў, і быў створаны гэты аб'ект, абсталяваны канал, узведзеная інфраструктура. Цяпер у Цэнтры займаецца 700 дзяцей з абласнога цэнтра і раёнаў вобласці. Трэнеры ладзяць пошукавыя экспедыцыі ў раёны, каб выяўляць здатных да веславання хлопчыкаў і дзяўчынак. Калі такія знаходзяцца і маюць жаданне займацца спортам сур'ёзна, іх забіраюць у Брэст, тут ёсць магчымасць жыць і вучыцца, трэніравацца на вяслярным канале. Прыкладам можа служыць Таццяна Кухта з Кобрынскага раёна. Чэмпіёнку Еўропы ўзгадаваў менавіта брэсцкі Цэнтр.

З маленькай дзяўчынкі-пачаткоўкі выгадавалі тут і Крысціну Стараселец, якая сёлета на чэмпіянаце Еўропы да 23 гадоў у пары заваявала залаты медаль. І для Крысціны гэта не першая ўзнагарода высокай пробы. Брэсцкі Цэнтр займаецца не толькі акадэмічным веславаннем, але і веславаннем на байдарках. Тут таксама ўжо з'яўляюцца зоркі, першая з іх, несумненна, Алег Юрэня. Сёлета на трэцім этапе Кубка свету па веславанні на байдарках і каноэ ён заваяваў два залатых медалі, стаўшы найлепшым у заездах на 1000 і 5000 метраў.

Як і многія яго таварышы, Алег большую частку года трэніруецца ў Брэсце. Сёння прыкладна палова нацыянальнай алімпійскай зборнай па акадэмічным веславанні — выхадцы з брэсцкага Цэнтра. Тут адразу былі традыцыі менавіта гэтага віду веславання, таму байдарка крыху адстае, але паступова і спартсмены-байдарачнікі з Брэста пра сябе заяўляюць усё болей упэўнена. Яны падцягваюцца да сваіх калег, пачынаюць займаць заслужаныя месцы ў нацыянальнай камандзе. Паводле прагнозу Паўла Дзенісюка, яшчэ праз пяцігодку колькасць байдарачнікаў у нацыянальнай камандзе наблізіцца да паловы. Рэч у тым, што трэнеры растуць разам са спартсменамі. Бо па сённяшніх мерках трэнерскі калектыў у Брэсце даволі малады. Але прагрэс назіраецца. Скажам, малады трэнер Сяргей Нікапчук падрыхтаваў юных каністак, якія сталі трэцімі на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы.

## УЗНАГАРОДА З РУК ЛЕГЕНДЫ

Летам на брэсцкім вяслярным канале трэніруюцца многія беларускія знакамітыя спартсмены. Сёлета, напрыклад, быў Раман Петрушэнка. Літаральна тыдзень таму з'ехала Кацярына Карстэн. Яна, дарэчы, выступала актыўным удзельнікам жнівеньскіх рэспубліканскіх спаборніцтваў. Акрамя таго, што сама выходзіла на дыстанцыі, была своеасаблівым стымулам для пачаткоўцаў. Атрымаць узнагароду з рук легенды беларускага веславання для юных — найвышэйшая форма заахвочвання.

Сёння ўсё больш замежных спартсменаў выбіраюць брэсцкі Цэнтр базай для трэніровак. Скажам, трэніраваўся нядаўна хлопец з Грузіі. На чэмпіянаце свету ён паказаў другі вынік, саступіўшы, дарэчы, беларусу. Добры вынік паказаў і вясляр з Узбекістана. Трэнер апошняга сказаў, што налета ён прывязе сюды ўсю каманду. Аказалася, што той спартсмен быў у своеасаблівай «разведцы».

— Гэта вельмі добра, калі побач трэніруюцца спартсмены з розных краін, якія потым выходзяць на спаборніцтвы, — гаворыць Павел Дзенісюк. — Яны ўжо ведаюць адзін аднаго, ім не перашкаджае мандраж, якім суправаджаецца няведанне патэнцыяльных магчымасцяў саперніка. Так што трэніровачныя стасункі ідуць на карысць. Ну і вядома, прыём замежных спартсменаў — дадатковая магчымасць зарабіць грошы, каб потым накіраваць іх на ўдасканаленне падрыхтоўкі падрастаючай змены. Апошнім часам трэніраваліся весляры з Узбекістана, Казахстана. Зараз на маім стале шэраг заявак, будзем разглядаць, узгадняць графікі, — дадае дырэктар.

## ЗАРАБЛЯЦЬ НА ЖЫЦЦЁ

Яшчэ Цэнтр папаўняе свой бюджэт з дапамогай басейна, трэнажорных залаў, якія наведваюць гараджане. «Спорт — дарагое задавальненне, ён павінен умець на сябе зарабляць, — лічыць дырэктар. — Гэта няправільна — сядзець склаўшы рукі і глядзець у рот дзяржаве, якая накорміць. Трэба і самім варушыцца. Таму прыкладна трэцяя частка нашага калектыву, які налічвае 231 чалавека, — супрацоўнікі пазабюджэтных ставак. Яны і працуюць ў азначаным кірунку». Таму Цэнтрам праводзіцца цэлы шэраг розных мерапрыемстваў культурнай, сацыяльнай, не кажучы ўжо пра спартыўную тэматыку. Іх мэта — працаваць на імідж, заяўляць аб сабе, рабіць аб'ект пазнавальным і вядомым для шырокай грамадскасці. Як паказвае практыка, справа таго вартая.

Напрыклад, летам вялікі рэзананс атрымала мерапрыемства, якое можна назваць днём таты. Тады Цэнтр заклікаў бацькоў з бліжэйшага мікрараёна горада прыйсці ў выхадны дзень з дзецьмі і бясплатна пазаймацца спортам, патрэніравацца. Аказалася, адарваць ад канапы шаноўных татаў не так і складана. Варта кінуць кліч, арганізаваць рэкламу. Прыйшло многа маладых мужчын з сынамі і дочкамі, усе атрымалі мноства станоўчых эмоцый. А некаторыя адразу запісаліся ў басейн альбо трэнажорную залу.

Моладзь ведае вяслярны канал як места цікавых канцэртаў, флэшмобаў, дабрачынных акцый. Для мікрараёна Кавалёва адзіны вялікі спартыўны аб'ект стаў і аб'ектам культурным. Днямі тут прайшло ўрачыстае мерапрыемства з нагоды 80-гадовага юбілею ганаровага грамадзяніна Брэста і вобласці алімпійскага чэмпіёна Сяргея Макаранкі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

■ Футбол. Ліга Еўропы

# ПОЎНАЙ ЗАДАВОЛЕНАСЦІ ВЫНІКАМ НЯМА

## У стартавым матчы чарговага розыгрышу футбалісты БАТЭ згулялі ўнічыю з «Црвенай Звездай»

**На стадыёне «Райка Міціч» у Бялградзе барысаўчане правялі свой першы паядынак у групе Н. Да старту футбалісты сербскага клуба лічыліся фаварытамі сустрэчы, так атрымалася і на полі: яны часцей валодалі мячом, у той час як падапечныя Аляксандра Ермаковіча стараліся надзейна гуляць у абароне і дзейнічаць на контратаках.**

На 54-й хвіліне Неманья Радоньіч адправіў мяч у сетку варот Дзяніса Шчарбіцкага, але менавіта пасля гэтага моманту перавага ў гульні перайшла да футбалістаў БАТЭ. На 72-й хвіліне Мікалай Сігневіч ударам галавой зраўняў лік сустрэчы — 1:1. Лічбы на табло да заканчэння матча так і не змяніліся.

*— Мы маглі як перамагчы, так і саступіць. Поўнай задаволенасці вынікам няма,* — адзначыў **галоўны трэнер беларускага клуба Аляксандр ЕРМАКОВІЧ.** — *Калі сапернік вялікімі сіламі пайшоў наперад, у нас было шмат магчымасцяў пакараць яго за дадзеную прастору, але, на жаль, у завяршальных фазах нападзення мы дапускалі памылкі і не скарысталіся выгаднымі момантамі. БАТЭ не першы год выступае на гэтай еўракубкавай стадыі. Не ў крыўду «Црвене Звездзе», мы гулялі і з больш моцнымі сапернікамі. Хлопцы рэальна разумелі, што ў гэтым матчы можна было перамагчы.*

**Паўабаронца БАТЭ Мірка ІВАНІЧ** адзначыў, што на стадыёне ў Бялградзе была выдатная атмасфера, якая ў той жа час не ціснула на футбалістаў.

*— Мне на радзіме гуляць вельмі добра. Адчуваю падтрымку блізкіх. Даўно не быў у Сербіі, тым больш даўно не выступаў тут. Скосых позіркаў з боку з-за таго, што я футбаліст БАТЭ, не адчуваў. «Црвена Звезда» згуляла добра перш за ўсё як каманда, таму нікога персанальна вылучыць не магу. З аднаго боку, задаволены тым, як мы сыгралі. З іншага — прысутнічае і расчараванне. Усё ж такі далёка не ўсе моманты мы рэалізавалі. Зрэшты, лічу вынік заканамерным, прайграць было б крыўдна любой з камандаў. У нашай раздзявальні асаблівай радасці пасля нічыёй нікто не выказваў. Усе прынялі вынік як належнае,* — расказаў Іваніч.

Іншы матч групы Н паміж «Арсеналам» і «Кёльнам» скончыўся з лікам — 3:1 на карысць англійскага клуба.

У другім туры Лігі Еўропы БАТЭ 28 верасня прыме на сваім полі лонданскі «Арсенал», а «Кёльн» згуляе дома з «Црвенай Звездай».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by* ■

■ Здаровае харчаванне

# А ВАШЫ ДЗЕЦІ ЛЮБЯЦЬ КЕФІР?

## Дзіцячае харчаванне, якое мы сёння бачым на паліцах у крамах, — як айчыннай, так і замежнай вытворчасці — абсалютна бяспечнае



**Айчыннае — да таго ж і якаснае. Спецыялісты рэкамендуюць звяртаць на яго асаблівую ўвагу — часцей набываць, даваць сваім дзецям і нават ужываць самім. І вось чаму...**

У новых цэхах выпускаюцца сёння вадкія і пастападобныя малочныя прадукты на Ваўкавыскім «Беллакце», кансервы на мясной аснове — на Аршанскім мясакансервавым камбінаце. «Беллакт», дарэчы, мае поўную лінейку сухога дзіцячага харчавання для кармлення дзяцей ранняга ўзросту, у тым ліку лячэбныя і прафілактычныя сумесі і прадукты прыкорму. Асартымент сухога дзіцячага харчавання з улікам расфасоўкі і ўпакоўкі налічвае 65 найменняў, 22 з якіх — кашы.

### Кіндар, кюхе, кірхе?

Часта жаночым бізнесам называюць тое, што больш уласціва жанчыне, што, як лічыцца, яна ўмее рабіць лепш за ўсё: паслугі, сэрвіс, цырульніцкае майстэрства, гатаванне.

— Жаночы бізнес — гэта не кіндар, кюхе, кірхе (дзеці, кухня, царква), гэта больш шырокае паняцце. У нас ёсць свой стыль кіравання, які адрозніваецца ад мужчынскага, і гэта не добра і не кепска. Гэта закладзена асаблівасцямі прыроды мужчын і жанчын, — расказала **Наталля МАКАЕВА, дырэктар праграмы Executive MBA.** — Жанчыны больш чуюць людзей, настроены на будаванне адносін і не шкадуюць на гэта часу. Яны проста нараджаюцца з генам умення наладжваць стасункі і ўзаемадзейнічаць.

**Згодна з даследаваннем ЕБРР, у Беларусі на 10 мужчын, якія бяруць крэдыт на развіццё сваёй справы, прыходзіцца толькі адна жанчына. Мужчыны на 60% часцей за жанчын карыстаюцца крэдытнымі картамі, а імавернасць адмовы ў крэдыце жанчыне на 55% вышэйшая.**

**Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын»: «У Беларусі 53% насельніцтва — жанчыны, амаль 50% з іх занятыя ў эканоміцы. Сучасны парламент на 33,7% складаецца з жанчын, прытым што ў склад двухпалатнага парламента ў сусветнай практыцы дапускаецца максімум 28% жанчын».**

Яна заўважыла, што цяпер так шмат кажуць пра важнасць існавання жанчын-кіраўнікоў таму, што наспеў час, калі людзі хочуць да сябе іншых адносін ад кіраўніцтва.

— Змяніўся свет, змяніліся і людзі, у іх з'явіўся большы доступ да інфармацыі, да адукацыі. Сучасны чалавек хоча адэкватнага дастойнага стаўлення да сябе, чакае ад кіраўніка чалавечых адносін. Асаблівасць кіравання, уласцівую жанчыне, пераймаюць і мужчыны. Цяпер не працуе прынцып «я начальнік, ты — дурань». Трэба ўцягваць супрацоўнікаў у працэс, мець з імі адны каштоўнасці, размаўляць. Я ўпэўнена, што ў бізнесе, як і ў сям'і, павінна быць гарманічная, узаемадапаўняльная каманда.

Атрымоўваць зваротную сувязь ад сваіх учынкаў, чуць ацэнку сваіх дзеянняў, ведаць пра свае памылкі аднолькава важна кіраўнікам абодвух полаў. Галоўнае — не забівацца, што эфектыўны кіраўнік заўжды лідар, які ўмее прызнаваць свае памылкі публічна. Кіраўнік, які лічыць, што ён усё ведае, асуджаны на няўдачу.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by* ■

■ Супрацоўніцтва

# 10 КАНТРАКТАЎ І ТАВАРААБАРОТ У $1 МЛРД

**Кіраўнік БелГПП расказаў аб выніках дыялогу беларускіх і індыйскіх бізнесменаў**

**Падводзячы вынікі форуму дзелавых колаў у Нью-Дэлі, які адбыўся напярэдадні афіцыйнага візіту Прэзідэнта нашай краіны ў Індыю, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ адзначыў, што двухбаковыя эканамічныя адносіны сапраўды выходзяць на новы этап.**



Фота БЕЛТА.

«На мой погляд гэта таксама і новы этап у развіцці знешнеэканамічнай палітыкі нашай краіны. Згодна з нацыянальнай стратэгіяй падтрымкі экспарту да 2020 года важнай задачай для нас з'яўляецца прасоўванне беларускіх зборачных вытворчасцяў на новыя рынкі. Сёння мы назіраем упэўненае іх развіццё», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч.

Ён таксама нагадаў, што індыйскі рынак аналізуецца беларускімі дыпламатамі і спецыялістамі ўжо доўгі час. Гэта значна паўплывала на эканамічны дыялог дзвюх краін. «На маю асабістую думку, для Беларусі і Індыі перайсці за мільярд долараў узаемнага тавараабароту — рэальна», — адзначыў Уладзімір Улаховіч. У першым паўгоддзі сёлета ўжо назіраецца рост гэтага паказчыка. Паводле яго слоў, калі ўлічыць кантракты, якія падпісалі на форуме, то ў гэтым годзе павінен быць яшчэ больш прырост.

«На бізнес-форуме было падпісана ў суме 10 мемарандумаў, пагадненняў і кантрактаў. Больш за 20 айчынных кампаній наведалі Нью-Дэлі. Кампанія БелАЗ падпісала пагадненне на пастаўку 50 велікагрузаў сумесна з індыйскімі партнёрамі на рынак Мазамбіка і кантракт на пастаўку 10 кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю 136 тон для пастаўкі ў Індыю», — расказаў Уладзімір Улаховіч. Таксама ён адзначыў, што абмяркоўвалася адкрыццё сэрвіснага цэнтра БелАЗ і пытанне аб стварэнні зборачнай вытворчасці ў далейшым. «Кампанія БелАЗ паспяхова канкуруе ў Індыі з тэхнікай Komatsu і Caterpillar. Наступны тэндар, які абвясціў урад гэтай краіны, — 250 велікагрузных аўтамабіляў. Ведаючы рэпутацыю нашых велікагрузаў, магу сказаць, што ў нас ёсць вельмі вялікі шанц атрымаць гэты кантракт налета», — адзначыў Уладзімір Улаховіч.

Што датычыцца МТЗ, то пытанне аб стварэнні зборачнай вытворчасці, па словах старшыні БелГПП, ужо прапрацавана. «Магчыма будзе забяспечыць выпуск 4 тысяч трактароў з узроўнем лакалізацыі да 50%. Гэтыя машыны будуць найбольш прымальнымі для прыватнай фермерскай гаспадаркі Індыі», — растлумачыў ён. Акрамя таго, зараз ідзе абмеркаванне зборачнай вытворчасці седлавых цягачоў сумесна з МАЗ. Вывучаецца і айчынны электробус.

Кампанія Гомсельмаш таксама падпісала падчас форуму кантракт на пастаўку абсталявання і камплектуючых на суму больш за 730 тысяч долараў. У сферы фармацэўтыкі было падпісана тры пагадненні. «Фармацэўтыка для нашай краіны з'яўляецца вельмі важнай тэмай. Падпісанне гэтых дакументаў у будучыні дазволіць панізіць кошт для грамадзян Беларусі лекавых прэпаратаў вельмі шырокага профілю», — растлумачыў Уладзімір Улаховіч.

Таксама варта адзначыць, што на мерапрыемстве быў заключаны дагавор стратэгічнага характару кампаніяй «Белзамежбуд» з Нацыянальнай будаўнічай карпарацыяй Індыі. Гэта доўгатэрміновы дакумент, які прадугледжвае ўдзел беларускіх спецыялістаў у праектаванні і будаўніцтве на рынках трэціх краін з удзелам айчынных праектных інстытутаў, інжынераў і іншых спецыялістаў. Акрамя таго, Уладзімір Улаховіч адзначыў важнасць мемарандума, які падпісала Беларуская калійная кампанія. Згодна з ім, Беларусь і Індыя павялічаць пастаўкі калійных угнаенняў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by* ■

■ Банкі

# ФІНАНСАВАННЕ МАЛОГА БІЗНЕСУ

## Белінвестбанк удзельнічае ў праектах па развіцці знешняга гандлю, падтрымцы жаночага прадпрымальніцтва і фінансаванні энергаэфектыўных праектаў

**Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР) падпісаў пагадненне аб выдзяленні Белінвестбанку субардынаванага крэдыту ў памеры 50 мільёнаў еўра тэрмінам на 6 гадоў. Гэтыя сродкі банк плануе накіраваць на фінансаванне мікра-, малога і сярэдняга бізнесу.**

Дэлегацыя ЕБРР на чале з яго прэзідэнтам сэрам Сумай Чакрабарці ў рамках свайго трохдзённага візіту ў Беларусь правяла дзелавыя сустрэчы з кіраўніцтвам Белінвестбанка. Адным з ключавых пытанняў сустрэч было абмеркаванне кірункаў карпарацыйнага развіцця банка і далейшага ўзаемадзеяння ў частцы рэалізацыі сумесных праектаў. Асаблівая ўвага была ўдзелена павышэнню фінансавай надзейнасці банка за кошт выдзялення субардынаванага крэдыту.

«За час працы Белінвестбанку і ЕБРР удалося пабудаваць даверныя партнёрскія адносіны, якімі мы вельмі даражым. Сумеснымі намаганнямі мы за кароткія тэрміны змаглі дасягнуць значных вынікаў у трансфармацыі банка. Субардынаваны крэдыт — гэта паказчык даверу ўсім тым людзям, якія зараз працуюць над паляпшэннем банка», — адзначыў Андрэй Брыштэль, старшыня праўлення Белінвестбанка.

На сённяшні дзень банк удзельнічае ў чатырох праектах ЕБРР: падтрымка крэдытавання мікра-, малых і сярэдніх прадпрыемстваў, садзейнічанне развіццю знешняга гандлю, падтрымка жаночага прадпрымальніцтва і фінансаванне энергаэфектыўных праектаў у нашай краіне. Агульны аб'ём сродкаў, атрыманых банкам ад ЕБРР, — каля 60 мільёнаў еўра.

Прэзідэнт ЕБРР Сума Чакрабарці заявіў: «Прайшло два гады з таго часу, як мы прыступілі да місіі па пераўтварэнні Белінвестбанка. Сёння мы дасягнулі вельмі важнага прамежкавага выніку, што дазваляе нам быць задаволенымі тым, як мы рухаемся па намечаным шляху. Выдзеленыя вашаму банку дадатковыя рэсурсы будуць не толькі накіраваны на капіталізацыю банка, але таксама будуць садзейнічаць павелічэнню долі прыватнага капіталу ў банкаўскім сектары краіны».

Як стала вядома, улады Беларусі і ЕБРР вядуць перадпрыватызацыйную падрыхтоўку па продажы Белінвестбанка. Вылучэнне субардынаванага крэдыту, які можа быць канвертаваны ў акцыі, з'яўляецца адным з пунктаў гэтай праграмы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

■ Постаці

# ЯГО ЛЁС, ЯГО ВІЛЬНЯ

## Заўтра спаўняецца 105 гадоў з дня нараджэння Максіма Танка

**1930-я гады — вельмі складанае дзесяцігоддзе ў жыцці Максіма Танка: актыўная падпольная дзейнасць, неаднаразовыя арышты, паднявольнае становішча Заходняй Беларусі. У той жа час гэта і перыяд станаўлення творчай індывідуальнасці паэта. За дзесяць гадоў было напісана шмат вершаў, якія склалі першыя зборнікі маладога творцы: «На этапах» (1936 г.), «Журавінавы цвет» (1937 г.), «Пад мачтай» (1938 г.); і ўжо першы з іх быў прыхільна сустрэты крытыкамі і сталымі творцамі. Вядома, раннія творы М. Танка не былі пазбаўлены шматлікіх уплываў. Польскія рамантыкі, Ясенін, Маякоўскі, згуртаванне «Маладняк», польскія мадэрністы з кракаўскай «Авангарды» ды віленскія «Жагары» звычайна вылучаюцца як найбольш яркія і значныя. Але тут гучаў і ўласны голас маладога паэта.**



Максім Танк нарадзіўся і вырас у сельскай мясцовасці, таму ў яго ранняй паэзіі пераважаюць вершы з апісаннем пейзажу вясковага, роднага паэту, які бачыўся яму яркім, рознакаляровым, светлым і цёплым.

Гарадское жыццё закранула паэта, і ў яго лірыцы з'явіліся новыя матывы. Дастаткова цікавым падаецца назіранне: чытаючы вершы ў храналагічнай паслядоўнасці адпаведна часу іх напісання, па характары і колеравай гаме гарадскога пейзажу можна прасачыць працэс змены адносін паэта да горада як з'явы.

У 1930-я гады Максім Танк становіцца вучнем Віленскай рускай гімназіі імя А. Пушкіна. Адбываецца знаёмства простага вясковага хлопца з сапраўды вялікім горадам. Таму ў першым вершы пра горад, які датуецца 1930 годам, паэт паказвае гарадскія рэаліі праз прызму светабачання жыхара вёскі. Ён не выказвае адносін да горада, а толькі параўноўвае чужыя гарадскія з'явы з роднымі, вясковымі з мэтай зрабіць іх больш блізкімі і зразумелымі. Каб паказаць усю моц уражання, паэт дакладны малюнак дапаўняе гукавым суправаджэннем:

*Снежны вецер ходзіць-блудзіць паркамі.*
*Пад нагамі брук звініць, звініць.*
*Агні рэклам рознакаляровымі яшчаркамі*
*Грэюцца ў вітрынах камяніц.*

На жаль, першыя сустрэчы Танка з Вільняй нельга назваць удалымі: марны пошук працы, нястача, частыя вяртанні з гэтай прычыны ў вёску, таму яму даводзілася шмат кіламетраў пераадольваць пешшу. У такі няпросты час у паэта з'явілася свая хітрасць, як выглядаць прыстойна, асабліва гэта датычылася парваных шкарпэтак (у сваім дзённіку ён дзеліцца сакрэтам). Каб замаскіраваць дзіркі на іх, ён раіць замазваць агеленыя імі часткі чарнілі чарнілами ці вугалем: так дзіркі не будуць вельмі моцна кідацца ў вочы. У 1932 годзе за супрацоўніцтва ў легальным і нелегальным камуністычным друку Максім Танк трапляе ў Лукішкі. Горад становіцца яшчэ больш няўтульным для паэта: з вокнаў, забраных турэмнымі кратамі, ён бачыць зусім іншы гарадскі пейзаж: «памыйныя ямы, сырыя кварталы», занесеныя «граззю і снегам». Нават першы снег у горадзе падаецца з'явай нелагічнай, кантраснай у адносінах да агульнага ўражання ад яго. Паэт супрацьпастаўляе першы снег у брудным горадзе, дзе ад яго становіцца больш бруду, са снегам у вёсцы, дзе ён прыбірае «ў сцюдзёныя зоры старыя медныя бор». У гэты час для Танка горад пачынае асацыявацца з астрогам, які з утульнага спакою вёскі падаецца чымсьці страшным і пагрозлівым.

Супрацьпастаўленне горад — вёска становіцца асобным матывам у ранняй творчасці паэта. Найбольш яркім у гэтых адносінах з'яўляецца верш «Павязлі цягнікі». Шчодрыя, яркія, сонечныя вёскі, якія складаюць песні працы, «песні пра восень // І пра жоўтае лісце дарожных бяроз», аддаюць восень (вынікі сваёй працы) гарадам: «Сівым камяніцам, // Сутарэннам глыбокім, // Сырым», якія ніколі не могуць «удоваль напіцца // таго сонца...» А ад зайздрасці да яркасці і багацця вёскі, пачуўшы смелую вясковую песню працы, гарадскія бяздушныя «вітрыны // Раптам гаслі, // Трывожна крычалі гудкі...» Жыхароў жа гарадоў, пазбаўленых радасці працы ў полі, паэт са спачуваннем называе «сіротамі малымі». У гэтым вершы М. Танк паказвае прыклад арганічнага сплаву па-народнаму простай фальклорнай вобразнасці з асацыятыўнай, мадэрнісцкай па сутнасці.

Падобная ідэя прасочваецца і ў вершы «Заснулі плошчы, купалы і ліпы...»: уночы, калі горад спіць (начны гарадскі пейзаж выклікае замілаванне ў паэта, бо навокал пануе амаль вясковая цішыня і таямнічасць: «...Злізала ноч неонаў сініх кроў, // І брук апошні шэлест вуліц выпіў // І пераклічку завадскіх гудкоў»). Буда, Магамет і Хрыстос пакідаюць муры бажніц і накіроўваюцца ў вёску, «Туды, дзе стрэх салома залаціцца, // дзе месяц жне, спазнішыся, авёс», і ніякая пустая скарбонка не можа вярнуць багоў назад у асірацелы без іх горад, бо «тады цвіла ў палях пахучых віка, // Тады трубілі гусі над ракой».

Начны гарадскі пейзаж для паэта хавае ў сабе нейкую таямніцу, пагрозу, ён нават параўноўвае вуліцы ўночы з траншэямі, «дзе смерць і забыццё таіцца». У той жа час горад знаходзіцца ў прадчуванні, у чаканні чагосьці новага, важнага: «З нямой мальбою і надзеяй // Ўзняліся ў неба камяніцы». Да таго ж у горадзе сканцэнтравана вялікая сіла, здольная выклікаць змены, тут паэт можа знайсці шмат змагароў-аднадумцаў: «Можа, трапім з табою мы ў Вільню, у Вронкі, у Гродна... // Там спаткаем нямала знаёмых сваіх...»

Напачатку Вільня падаецца паэту няўтульнай, чужой, сырой. У вершы «Вільня» для апісання гарадскога пейзажу ўвечары ён выкарыстоўвае цёмныя колеры: сівы, сіні, чорны, шэры; а таксама адухаўляе і персаніфікуе з'явы прыроды: «дождж заплакаў», «ноч прыйшла з прадмесця», «дождж заплёскаў граззю», «дождж блудзіць па бруку гразкім». У процівагу гэтай карціне з'яўляецца светлае «заўтра», «песні-сны ў нашых казках», і менавіта К. Каліноўскага, які ўжо стаў зданню, што «гаворыць з ветрам», лірычны герой абірае суразмоўнікам, якому можна давяраць таямніцы. Ён звяртаецца да паўстанца як да таварыша па сумеснай барацьбе: «Пра тых байцоў, што палі ў маршы, // Мо раскажаць табе, таварыш?» — і нібы жывога. Зусім як Маякоўскі ў сваіх маналогах, папярэджвае таварыша: «Цішэй, ідзе бульварам варта».

**У нашы дні шануецца памяць пра Максіма Танка: да 100-годдзя паэта 5 гадоў таму выйшлі паштовая марка і памятная манета Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, у 2014 годзе ў Мядзеле, на яго малой радзіме, быў усталяваны помнік.**

Паступова Максім Танк пачынае заўважаць прыгажосць і на шэрых вуліцах горада. Ён выказвае шчырае замілаванне начнымі ліхтарамі: «Ліхтары над вадою навіслі. // Іх сарвала паводкай і ўдаль панясло...» . Менавіта ліхтары падаюцца яму жывымі.

Паэт разумее горад, ён становіцца родным: у першапачатковым варыянце верш «Вільня» заканчваўся двухрадкоўем:

*Ну дзе ж прытуліш мяне, горад,*
*Мяне прытуліш без начлегу?*

Верш «Вільня», які мы маем зараз, заканчваецца радкамі:

*Ну дзе ж сягоння, родны горад,*
*Мяне прытуліш без начлегу?*

Эпітэт «родны» тут з'явіўся невыпадкова: М. Танк зразумеў, што нават шэрае, бруднае на першы погляд месца можа стаць родным, блізкім, і менавіта пачуцці, перажытыя ў гэтым месцы, робяць яго такім. У той жа час частка яго душы застаецца ў вёсцы:

*Як быццам, адходзячы ў горад,*
*Забыўся асенняй парой*
*Сказаць, каб шчаслівыя зоры*
*Гарэлі над вёскай маёй.*

У паэзіі Максіма Танка 1930-х гадоў мы назіраем паступовы пераход ад неразумення і непрымання горада, супрацьпастаўлення яго, чужога, роднай вёсцы да ўспрымання горада як свайго, адчування яго прыгажосці і велічнасці, еднасці з іх лірычным героем.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# УБАЧЫЦЬ ГУТЭНБЕРГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дагэтуль выданне захоўвалася ў Нацыянальнай бібліятэцы Германіі ў Лейпцыгу. У нашу ж краіну яго дастаўлялі ў суправаджэнні экспертаў-кнігазнаўцаў, дыпламатаў і супрацоўнікаў аховы.

Біблія Гутэнберга лічыцца не толькі пачаткам гісторыі кнігадрукавання ў Еўропе, але і пазнакай пераходу ад Сярэднявечча да сучаснасці. Гэтая кніга, надрукаваная высакародным гатычным шрыфтам, прызнана шэдэўрам вытанчанага друку і мастацкага майстэрства. Біблія цалкам надрукавана ў дзве калонкі. Буквіцы і загалоўкі, аздобленыя каляровымі ўпрыгажэннямі, выкананы ўручную. У свеце захавалася толькі некалькі асобнікаў унікальнага выдання, і зусім невялікая колькасць краін свету можа дазволіць сабе прадэманстраваць гэтую кнігу публіцы.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Выстаўку адкрываюць старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ.**

Падчас цырымоніі адкрыцця акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, уладальнік медаля Францыска Скарыны Дзяніс Паршын з'явіўся каля галоўнага ўвахода ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі ў вобразе... самога Францыска Скарыны. «Тое, што сёння Нацыянальная бібліятэка сабрала маю спадчыну на адной міжнароднай выстаўцы — найлепшы доказ таму, што мая эпоха, мая дзейнасць вам неабыякавыя! Кожная краіна, дзе некалі я жыў і працаваў, зрабіла свой унёсак, каб гэтая выстаўка адбылася. І ў тым, што вы, удзячныя нашчадкі, здолелі гэты скарб захаваць, вывучыць і даць магчымасць усім людзям яго спазнаць, я бачу сувязь нашых эпох!» — дэкламаваў уяўны першадрукар.



**Дзяніс ПАРШЫН у вобразе... самога Францыска Скарыны.**

Варта адзначыць, што побач з унікальным выданнем у экспазіцыі дэманструецца факсімільнае выданне поўнай Бібліі Гутэнберга, выкананае ў 1913 годзе ў Лейпцыгу. Сёння гэта выданне таксама лічыцца бібліяграфічнай рэдкасцю: яно прыбыло на выстаўку з Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў Маскве.

Выстаўка «Францыск Скарына і яго эпоха» справядліва лічыцца ўнікальнай. Наступную, аналагічную, можна чакаць хіба што праз 500 гадоў, у 2517-м.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

# ГЛЕДАЧАМ — АД КОЛАСАЎЦАЎ. З ЛЮБОЎЮ

**Камедыйным спектаклем «Несцерка», якому сёлета 75 гадоў, распачаўся 92-і сезон Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.**

Гледачы чакаюць ад віцебскага тэатра ў ліку іншага новых цікавых пастановак. І яны будуць абавязкова! У прыватнасці, запланавалі паставіць «Сымона-музыку» паводле твора Якуба Коласа. Напэўна, даўно трэба было. Бо, як прызналі прадстаўнікі адміністрацыі ўстановы культуры, у тэатра, які носіць імя славутага Коласа, павінен быць годны коласаўскі спектакль. І, безумоўна, яго можна было б зрабіць творчай візітнай карткай калектыву.

У найбліжэйшым часе — прэм'ера рамантычнай камедыі «Самая жаданая» паводле п'есы сучаснага беларускага драматурга Сяргея Гіргеля «Самая-самая» рэжысёра Ніны Обухавай. Адну з галоўных роляў выконвае народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Тадэвуш Кокштыс. Прэм'ерныя паказы спектакляў адбудуцца 22 і 23 верасня.

А ў кастрычніку — паказ аднаўленай пастаноўкі «Перабор» паводле Х. Бергера рэжысёра Міхася Краснабаева. На першы погляд спектакль пра звыклы любоўны трыкутнік. Насамрэч кутоў там больш. Трэба толькі быць шчырым — і тады даведаешся шмат. І пра ўласную жонку, і пра свайго суседа.

У спісе запланаваных прэм'ер: «Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра, «Прыгоды Чыпаліна» паводле Дж. Радары і іншыя. У планах — супрацоўніцтва з замежнымі рэжысёрамі — з Расіі і Латвіі.

А 11 кастрычніка спектакль «Шагал... Шагал...» убачаць на XXXIII Міжнародным тэатральным фестывалі «Ліпецкія тэатральныя сустрэчы». Паставіў яго заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віталь Баркоўскі.

У верасні два акцёры тэатра святкуюць свае юбілеі. 24 верасня спектаклем «Дзіўная місіс Сэвідж» Д. Патрыка адзначыць юбілейную дату заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова. А 27 верасня вядучы майстар сцэны Юрась Цвірка запрашае ўсіх на 50-годдзе. Аматарам яго творчасці прыйдзецца даспадобы камедыя «Доктар філасофіі» Б. Нушыча, дзе Юрась выконвае галоўную ролю Жываты Цвіёвіча...

Кошт білетаў на коласаўскія спектаклі даступны. На дзіцячыя — 4—4,5 рубля, для дарослых — 6,5—8 рублёў.

***P.S.*** Днямі адбыўся сход творчага калектыву, на якім прысутнічаў міністр культуры Барыс Святлоў. На мерапрыемстве стала вядома, што новым мастацкім кіраўніком віцебскага тэатра прызначаны рэжысёр-пастаноўшчык Міхась Краснабаеў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

**Вернісаж**

# Энергетычны запал ад Валерыя Славука

## Атрымаюць наведвальнікі рэтраспектыўнай выстаўкі майстра ў Палацы мастацтваў

**Нават для яго самога было нечакана, што жыццё прывядзе ў мастацтва: пасля заканчэння школы юнак і паняцця не меў пра графіку. Сёлета майстру споўнілася 70 гадоў, і ён удзячны Богу за магчымасць быць не проста датычным да мастацтва, а быць унутры яго працэсаў.**



Валерый Славук вядомы як кніжны графік: адметныя яго ілюстрацыі да кніг «Айвенга» Вальтэра Скота, «Чорны млын» Юрыя Брэзана, «Шляхціч Завальня» Яна Баршчэўскага, «Вясна ўвосень» Уладзіміра Караткевіча, да беларускіх народных казак «Удовін сын», «Алёнка», да кнігі казак «Цудоўны свет» і мноства іншых. Яго творчасць вядомая не толькі ў нашай краіне, мастак працаваў і над ілюстраваннем твораў замежных аўтараў.

У гэтыя дні ў Палацы мастацтваў адбылося адкрыццё рэтраспектыўнай выстаўкі Валерыя Пятровіча, дзе кожны глядач зможа ўбачыць як знаёмыя, пазнавальныя, так і фантастычныя сюжэты і вобразы.

Прагляд такіх экспазіцый можа доўжыцца бясконца. Справа ў тым, што вобразы з карцін Валерыя Славука валодаюць асаблівай энергетыкай, з імі нават можна весці дыялог — і яны адгукаюцца. У чым сакрэт, спытаеце вы? Усё проста — героі жывыя, майстар шмат чытаў пра іх, а пасля прыдумляў сітуацыі і задачы, якія персанажы павінны вырашаць. Графіка Валерыя Славука патрабуе ўважлівага гледача, які з цікавасцю паглыбіцца і ў дзяцінства, і ў гісторыю.

— Так незаўважна праляцеў час, здаецца, не паспеў агледзецца, а ўжо 70 гадоў, — прызнаецца юбіляр. — Спачатку думаў зрабіць невялічкую выстаўку апошніх работ у Акадэміі мастацтваў, але мне пашанцавала — папрасілі зрабіць рэтраспектыву, што цяпер нячаста бывае. Падумайце: адны толькі рамы чаго вартыя! Усё ж такі афорт — цяпер рэдкая тэхніка, таму ў зацікаўленых людзей ёсць магчымасць прасачыць развіццё гэтага жанру мастацтва. На мой погляд, апошнія работы саступаюць тым, што ствараліся раней, але тут адыграў сваю ролю цяперашні момант: здаецца, больш спрыяльныя для творчасці час мінуў.

Пакольні праект рэтраспектыўны, то і прастора для роздуму шырокая. Такое адчуванне, што на першым паверсе Палаца мастацтваў прадстаўлена ўся беларуская міфалогія. Адсюль і вынік: выстаўку карысна паглядзець як дарослым, так і дзецям. Валерый Славук сцвярджае, што яго характар ніяк не суаднosіцца з творчасцю. Але трэба ведаць гэтага аўтара, каб зразумець, колькі энергіі і запалу ў яго афортах.

— Я не раблю сучасныя або толькі гістарычныя творы, у апошні час я магу сабе дазволіць рабіць тое, што прыходзіць у галаву, — прызнаецца аўтар. — А я, як вы бачыце, люблю розныя падыходы да мастацтва. Хоць унутры мяне цяпер жыве цэнзар больш строгі, чым быў раней. У мяне часта пытаюцца пра любімыя работы, а такіх няма, таму што ўсе дарагія: калі працуеш над творам, пражываеш з ім частку жыцця. Гэта як з чалавекам — за ўсё трэба быць удзячным.

Валерый Славук прызнаецца, што вельмі любіць жыццё і сваю справу. Ён ніколі не возьмецца за работу, калі тэма не зачапіла, шукае ў кожным заказе інтрыгу, арыгінальны сюжэт. І калі знаходзіць, не можа адарвацца ад працы. З выдавецтвамі Валерый Славук цяпер практычна не працуе: на яго думку, падыходы да аплаты за афармленне кніг патрабуюць удасканалення. Аўтар адзначае, што вельмі важна, калі ўкладаеш у работу душу, атрымаць аддачу, таму што толькі здаецца, што прыдумаць сюжэт і перанесці яго на паперу лёгка, насамрэч гэта патрабуе вялікіх высілкаў, як фізічных, так і маральных. Ён называе сябе лянівым мастаком, але заказы выбірае такія, каб дапамаглі ляноту перамагчы.

**Вікторыя АСКЕРА**



«Паядынак», 1984 г.

**На сцэне**

# КАХАЙ МЯНЕ ПА-ТРАВІЯТАЎСКУ

## Знакамітая опера Джузэпэ Вердзі аздобілася сучасным антуражам

**Латвійскі рэжысёр Андрэйс Жагарс, прыцягненне да пастаноўкі замежных прафесіяналаў, правакацыйная рэпутацыя адной з найзнакаміцейшых опер, «фішка» ў інтэрпрэтацыі твора XIX стагоддзя, кеды і кава «to go» — сёлета Вялікі тэатр оперы і балета прыгожа абыграў адкрыццё сезона. 8 і 10 верасня на яго сцэне адбылася прэм'ера ўжо шостай для Вялікага «Травіяты» Джузэпэ Вердзі. Класічная гісторыя кахання паміж куртызанкай Віялетай, якая хварэе на сухоты, і звычайным — выдатным хіба што здольнасцю кахаць — маладым чалавекам Альфрэдам трапіла ў сучасны антураж. Тут галоўная гераіня хварэе на рак, персанажы носяць джынсы і пакутуюць на канапах сучаснага дызайну. Але гісторыя, з яе архаічнасцю, эмацыйнасцю і трагічнай канцоўкай, у гэтых сучасных інтэр'ерах трымаецца першапачатковых акцэнтаў, чаму і ўзнікае пытанне: ці асучаснівалася «Травіята» з нейкім сэнсам альбо толькі дзеля прыцягальнай «фішкі»?**



Першакрыніцай оперы з'яўляецца нашумелы ў свой час раман Аляксандра Дзюма малодшага «Дама з камеліямі», які быў названы амаральным за выявядзенне куртызанкі на ролю галоўнай гераіні і тым не менш трапіў у лік дасягненняў сусветнай літаратуры. Ёсць падобны кантраст і ў гісторыі «Травіяты», першая пастаноўка якой праваліласся, а праз наступныя опера стала адной з найпапулярнейшых у свеце. Ролю Віялеты выконвалі Марыя Калас, Магда Алівера, Тэрэза Стратас, Ганна Мофа, Ганна Нятрэбка і іншыя. Можна пагладзець, дарэчы, «Травіяту» з Ганнай Нятрэбкай у галоўнай ролі — таксама асучасненую, альбо, хутчэй, пераведзеную ва ўмоўна (без красовак) сучасную ўніверсальную тэрыторыю, маўляў, такое пачуццё можа належаць любому стагоддзю.

Складанасць асучаснівання «Травіяты» ў тым, што архаізм заключаецца ў самой яе сутнасці. Згодна з сюжэтам Віялета кідае тусовачнае жыццё, вечарыны, салоны, каб жыць разам з Альфрэдам у загараднім доме ў каханні і згодзе. Але тут з'яўляецца Жорж Жэрмон, бацька каханага, і ў прыватнай размове з Віялетай кажа, што саюз яго сына з такой асобай кідае цень на рэпутацыю сям'і, з-за чаго не можа адбыцца вяселле дачкі. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што Альфрэд жыве, сам гэтага не заўважаючы, за кошт каханай жанчыны, якая з-за недахопу грошай паціху пачынае распрадаваць маёмасць. Хвацка аўтар гісторыі ўскладніў становішча галоўнага героя! Кахаць куртызанку ды яшчэ і жыць за яе кошт. Вядома ж, для свайго часу гісторыя, апісаная ў рамане Дзюма (заснаваная, дарэчы, на гісторыі з жыцця самога Аляксандра Дзюма, яго бацькі Аляксандра Дзюма старэйшага і куртызанкі Мары Дзюплесі), прагучала правакацыйна і па-наватарску, бо адна справа для такога сюжэта — перадавацца з вуснаў у вусны ў якасці гарадской плёткі, а іншая — публікавацца ў выглядзе рамана.

Сіла «Дамы з камеліямі» і «Травіяты» якраз у супрацьстаянні свайму часу. Раказ дзіўнай і трагічнай гісторыі кахання, якая кідае выклік грамадству і яго традыцыйнай маралі, кажа такім чынам, што пачуцці стаяць вышэй за вонкавыя абставіны, дыктат «нармальнага» і рэпутацыю сям'і. Менавіта таму «Травіята» больш арганічна выглядае ў асяроддзі свайго XIX стагоддзя, дзе ярчэй мільгаюць знакі сапраўднага кахання. І сучасны глядач — спажывец любога мастацтва — здольны ўспрымаць твор у кантэксце часу стварэння, прымаючы яго ўмовы. Калі ж «інтэрпрэтатар» вырашае адарваць оперу ад кантэксту, варта перабудаваць яе канцэпцыю, замяніць акцэнты, стварыць новыя сэнсы, чаго ў варыянце Андрэйса Жагарса, на жаль, не адбываецца. Таму перанясенне дзеяння «Травіяты» ў сённяшні дзень, калі опера страчвае даволі значны змястоўны падмурак і бляднее, выглядае даволі простым — выключна вонкавым — мастацкім рашэннем, хоць і цікавым для рэпертуару Вялікага тэатра оперы і балета. Гісторыя паслядоўна, у традыцыйным кірунку, апавядаецца на фоне актуальнага матэрыяльнага свету, які нічога ў яе не прыўносіць — толькі адбірае.

> **Хвацка аўтар гісторыі ўскладніў становішча галоўнага героя! Кахаць куртызанку ды яшчэ і жыць за яе кошт.**

У размове з Жоржам Жэрмонам Віялета згаджаецца ахвяраваць сваім шчасцем і кінуць Альфрэда, таму пасля цудоўнага, па Вердзі, вакальнага выказвання пачуццяў яна збягае на чарговую вечарыну, што становіцца пачаткам канца. Складана паверыць у сучаснасць гэтага канфлікту, згодна з якім рэпутацыя куртызанкі непасрэдна ўздзейнічае на шчасце сястры яе бойфрэнда — не, такія матывы для стварэння драматычнай сітуацыі наўрад ці выглядаюць арганічна побач з сучаснай канапай. Матыў усеабдымнага, касмічнага, поўнага трагізму кахання — таксама знак мастацтва мінулых стагоддзяў, што ізноў правакуе разрыў паміж зместам «Травіяты», пастаўленай у Вялікім, і створаным антуражам. Сёння каханне не становіцца асновай гіпербалізаваных трагедый, мы ставімся да гэтага пачуцця больш спакойна і прывыклі пакідаць «страсці» мастацтву мінулага. Тое ж датычыцца абразлівага становішча Альфрэда, які жыве за кошт куртызанкі, бо каму сёння такая дыспазіцыя пакажацца гучнай правакацыяй?

«Травіята», што абсалютна адпавядае свайму XIX стагоддзю, без шліфоўкі трапіла ў часы кавы на вынас, але пад іх не падстроілася. Опера Джузэпэ Вердзі — у яе звычайным выглядзе, — наадварот, патрабуе пэўных жарсцяў: больш карціннасці, больш пачуццяў, больш трагізму і высокіх нот. Усё гэта ў шостай «Травіяце» Вялікага тэатра ёсць, толькі карціннасць становіцца ў апазіцыю метаду асучаснівання; пачуцці не абыгрываюцца, а называюцца; трагізм застаецца без падмурка і высокія ноты — без трагізму (у галоўных ролях мне давялося ўбачыць Ірыну Кучынскую і Аляксандра Міхнюка).

> **«Травіята», што абсалютна адпавядае свайму XIX стагоддзю, без шліфоўкі трапіла ў часы кавы на вынас, але пад іх не падстроілася.**

У выніку Віялета, вядома ж, акажацца ў абдымках каханага, якіх хопіць толькі на апошнія хвіліны жыцця галоўнай гераіні. Пампрэ — і добра, а разгублены глядач накіруецца па сваіх справах. Таму што галоўнае, што ёсць у «Травіяце», — моц усюдыіснага кахання, якое разбурае грамадскія ўмоўнасці, — выцiснулася заманлівай вонкавай апрацоўкай. Толькі вонкавай.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

*katsyalovich@zviazda.by*



bolshoibelarus.by

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

Концыкі Пружанскага раёна

# ЧЫСЦІНЯ ЯК ЛАД ЖЫЦЦЯ




**Хутка дзясятак гадоў, як Аляксандр і Марыя Фаўстаўна Петруковічы застаюцца адзінымі жыхарамі невялікай вёскі Концыкі, што схавалася ў лясах, на самай мяжы з Бярозаўскім раёнам. За лесам крыху прайсці — і бярозаўская Малеч. А назва, паводле меркавання маці і сына, паходзіць ад слова «кончыкі», што значыць на канцы, на рагу былой панскай сядзібы, якая тут раней размяшчалася. Ад таго маёнтка фактычна нічога не засталося.**

— Але памяць, аказваецца, жыве. Бо перыядычна наведваюцца нейкія людзі з металашукальнікамі, — расказвае Аляксандр. — Адзін раз яны нават паказвалі карту 1900 года, на якой сядзіба пазначаная. Ды ніколі не чуў, каб тыя чорныя капальнікі знайшлі што каштоўнае. Забаўляюцца людзі, калі работы не маюць.

Работы ж у жыхароў Концыкаў хапае. Аб гэтым сведчыць агарод, кветнікі, двор — усё ідэальнай чысціні. Мы са старшынёй Ліноўскага сельскага Савета Таццянай Мардань вымушаны былі прызнацца, што такога парадку не бачылі на сельскіх падворках наогул. Звычайна ў гэту пору агароды стаяць ну не вельмі чыстыя. А тут: ні зялінкі там, дзе нядаўна была бульба, і там, дзе яшчэ растуць памідоры, а іншыя былыя градкі выглядаюць як здымкі на старонках спецыялізаваных часопісаў. Усё б нічога, каб нашы героі былі маладыя і здаровыя. А тут крыху іншы выпадак.

Аляксандр — інвалід па зроку першай групы, яго



87-гадовая матуля перасоўваецца толькі з дапамогай кійка і то з вялікай цяжкасцю, бо моцна баляць ногі. «Калі часам упадзе, даводзіцца паднімаць, сама ўжо не здолее», — расказвае сын. Але свае немачы бабуля Марыя не лічыць прычынай для таго, каб сесці ў крэсла і нічога не рабіць. У агародзе яна ўсё роўна ўмудраецца шчыраваць. Гэтым летам яшчэ і калодзеж сама пафарбавала.

Яна і сняданак, абед, вячэру сама гатуе. Сын прыносіць усе інгрэдыенты для супу альбо другой стравы, маці і агародніну пачысціць, і ўсё пакрышыць, уладкуе ў каструлю, яму застаецца паставіць пасудзіну на агонь. Таццяна Мардань звяртае маю ўвагу на алюмініевыя каструлі, што стаяць на пліце. Яны выглядаюць нібы ўчора купленыя, бо да бляску начышчаны. І ў доме ўсё нібы перад святам: стол з чысцюткім абрусам, квяцістыя занавескі, саматканыя ходнікі. Ды і сама гаспадыня сядзіць у надзвычай акуратненькім адзенні. А мы ж зазірнулі сюды па дарозе, загадзя не папярэджвалі.

— Усё ж ёсць арыстакратычная жылка ў нашай Марыі Фаўстаўны, — гаворыць Таццяна Мікалаеўна. — І выяўляецца яна ў ладзе жыцця, які мае на ўвазе абсалютную чысціню і парадак, што не залежаць ад здароўя, самаадчування гаспадароў. Ужо колькі гадоў сюды заязджаю і любуюся імі.

Цяпер, вядома, маці ў многім дапамагаюць дачка з мужам, якія жывуць у Пружанах. Ужо некалькі гадоў, як апошнія жыхары Концыкаў не трымаюць падсобную гаспадарку. Раней і куры, і свінкі былі. Цяпер, паводле слоў Аляксандра, жывуць з аўтакрамы. Два разы на тыдзень машына прыходзіць пад хату, і ўсе неабходныя прадукты можна купіць.

Марыя Фаўстаўна сама родам з суседняй вёскі Занявічы. У Концыках яны з мужам купілі невялікую хату ў 1964 годзе. Цяпер гэта хата выкарыстоўваецца як летняя кухня. Побач гаспадар узвёў новы прасторны дом для сям'і. Уладзімір Мікалаевіч працаваў на пілараме і быў выдатным цесляром. Не адзін дом пабудаваў людзям у ваколіцы. «А тут кожная дошчачка ім аблюбаваная», — успамінае бабуля Марыя.

Успаміны даюцца нялёгка галоўным чынам таму, што бабуля амаль зусім не чуе. «Ідзі сюды, Саша, — кліча яна сына, — будзеш маім перакладчыкам». А ён неяк прызвычаіўся гаварыць з матуляй, яна і па губах яго разумее. Дык вось з дапамогай сына гаспадыня расказала, што больш за дваццаць гадоў працавала на ферме, цялят глядзела.

— У групе налічвалася 30 бычкоў. Усё рукамі трэба было рабіць: і кармы нацягаць, і вады, гной са стойлаў выбраць. Часам здавалася, што па пояс таго гною нагорнеш. Цяжка было, і плакала, і звальнялася, а потым зноў выходзіла на ферму, бо дзе



тут яшчэ работу знойдзеш. Цяпер і даяркі, і даглядчыкі працуюць у чысціні. А мы тады... Вось і ў нас у 80-х пабудавалі новую ферму, а мне час прыйшоў на пенсію ісці, — расказвае Марыя Фаўстаўна. — Ды і ўсе жанчыны з Концыкаў працавалі на ферме. Таццяна і Алена Мацкевіч, Марыя Кавальчук, Таццяна Ярась, Ганна Панасенка... Добрыя былі, працавітыя кабеты. Усе ўжо мае сяброўкі паўміралі. Па троечацвёра дзяцей мелі. Дзеці раз'ехаліся, у бацькоўскія хаты заязджаюць рэдка. Раней часта хадзіла на могілкі. Цяпер там уся вёска. А я ўжо не дайду туды.

— Яшчэ колькі гадоў таму маці ездзіла на веласіпедзе ў Бакуны ў краму, на ФАП, — дадае сын. — Цяпер вось фельчар з Бакуноў Вольга Патапчук да нас часам заязджае. Ну а яшчэ міліцыя зазірае, — дачнікі выклікаюць, калі ў іх зладзеі ў хлеў ці гараж залезуць. Летам у некалькі хат прыязджаюць людзі з горада. А восень прыйдзе — застаёмся адны, сядзім тыдзень, чакаем, пакуль сваякі ў выхадныя прыедуць. Але з Концыкаў сваіх нікуды не паехалі б.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Захапленні

# ЯКАРНАЯ АЛЕЯ

У цэнтры Бешанковічаў энтузіясты зрабілі ўнікальную алею — з якараў, якія дасталі з дна Заходняй Дзвіны

**У сваіх пачынаннях яны атрымалі падтрымку кіраўніцтва мясцовай улады.**

## З ГЛЫБІНІ 6 МЕТРАЎ

Андрэй Трубецкі, аўтар ідэі — індывідуальны прадпрымальнік, кіраўнік прыватнай фірмы, каваль, рамеснік. Ён таксама — краязнавец, калекцыянер прадметаў быту мінулага.

— Спачатку ўсталявалі ў парку памятны знак — у даніну памяці тых, хто жыў у былым мястэчку. І на п'едэстале невыпадкова замацавалі якар. Бешанковічы засноўваныя і развіваліся, у першую чаргу, дзякуючы рацэ. Судны тут прычальвалі значна раней, чым было заселена наваколле, — расказвае Андрэй.

Цяпер у якасці працягу рэалізацыі ідэі шанавання продкаў можна ўбачыць алею з васьмі якараў. Яна насупраць будынка, дзе знаходзіцца загс. І навaспечаныя муж і жонка з задавальненнем укладаюць кветкі да каменя, на якім апавядаецца пра алею.

Якары розных канструкцый зроблены ў XVII—XIX стагоддзях.





— Дасталі без акваланга з дна ракі разам з Андрэем Бурнейкам, таксама краязнаўцам. Аўтар тэксту памятнага знака — Станіслаў Леаненка, яшчэ адзін знаток гісторыі краю. Мы — тутэйшая тройца аматараў вывучаць даўніну, — працягвае Андрэй.

Знаходкі якараў на дне ракі яны тлумачаць проста. Калісьці па Заходняй Дзвіне праходзіла многа суднаў. У прыватнасці, баркі даўжынёй 50 і шырынёй 35 метраў. І часцей за ўсё якары апускалі пад ваду на пяньковых вяроўках. І, калі апошнія рваліся, якары заставаліся на дне на глыбіні прыкладна ад 4 да 6 метраў.

На алеі можна ўбачыць не ўсе якары з калекцыі Андрэя. Большасць — каля 15 — чакаюць свайго часу.

— Аднойчы на дне ўбачыў каменны якар. Некалькі разоў потым шукаў гэтае месца, ды не атрымалася, — працягвае суразмоўнік.

Расказаў ён і пра іншыя перспектыўныя аб'екты ў парку. У прыватнасці, Андрэй яшчэ задумаў усталяваць металічнае «дрэва закаханых». Паколькі ён сабраў багатую калекцыю жорнаў, плануе ўпрыгожыць імі тэрыторыю.

Падчас падводнага палявання часта бачыў на дне не толькі якары. Знаходкі папоўнілі калекцыю. І яе паказваe бясплатна — на тэрыторыі былога завода, які выкупіў для камерцыйнай дзейнасці. Частыя наведвальнікі — школьнікі.

## СВЕДКІ ГІСТОРЫІ

Андрэй некалькі гадоў таму ініцыяваў усталяванне помніка тым, хто загінуў падчас вайны. Ён знаходзіцца на мяжы Бешанковіцкага і Шумілінскага раёнаў. Андрэй актыўны ўдзельнік добраўпарадкавання старых яўрэйскіх могілак. Сюды штогод прыязджаюць розныя дэлегацыі і валанцёры, якія працягваюць работу...

Бешанковіцкі прадпрымальнік марыць цяпер, каб нейкі памятны знак з'явіўся на месцы абарончых земляных валоў і траншэй часоў вайны 1812 года. Адзначыў, што такіх больш нідзе ў Беларусі не ўбачыш. Ды і ва ўсёй Еўропе аналагічнае ў такім добрым стане — рэдкасць.

З асаблівай цеплынёй Андрэй распавядаў пра задумку ўвекавечыць месца, дзе знаходзіўся праваслаўны храм, пабудаваны ў XVIII стагоддзі. Свята-Мікольскую царкву ў 1899 годзе разабралі з-за таго, што яна была ў аварыйным стане... Цудам да нашага часу захаваўся вялікі металічны крыж з купала. Ён знаходзіцца на прыватным участку зямлі. Гасцінныя гаспадары дазваляюць прайсці да крыжа Андрэю і іншым мясцовым краязнаўцам з тымі, хто цікавіцца гісторыяй мястэчка.

У планах і стварэнне месца памяці ў раёне падзення савецкага ваеннага самалёта ПЕ-2

Фірма Андрэя знаходзіцца на беразе Заходняй Дзвіны. Побач — два будынкі былых панскіх складоў, пабудаваных у XIX стагоддзі. А недалёка ваенныя раскінулі пантон. Андрэй будзе рады дапамагчы стварыць у гэтым жывапісным месцы турыстычны комплекс... Упэўнены, што ён будзе папулярны.

У прыватнасці, расказаў пра аўтастрыйцаў, якія самастойна вырашылі падарожнічаць па Беларусі і заехалі ў Бешанковічы. Дык затрымаліся на чатыры дні! А, на першы погляд, што там такі доўгі час рабіць? З задавальненнем наведалі музей, аб'екты сацыяльнага прызначэння і іншае. Знаёмства з мясцовымі аматарамі даўніны іх здзівіла. Слухалі б і яшчэ, каб не трэба было вяртацца дамоў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Бешанковічы—Віцебск*



Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

■ Экскурс у гісторыю

# РАЗАМ З КРАІНАЙ, ПОБАЧ З ЛЮДЗЬМІ

## Вяртанне «Звязды»да мірнага жыцця

**Вядомы беларускі пісьменнік Алесь Петрашкевіч у адным з артыкулаў пісаў: «Калі б у Беларусі не было войнаў, у ёй пражывала б больш за 60 млн чалавек». А як вярталася Беларусь да міру пасля Вялікай Айчыннай? У пошуках адказу звернемся да гісторыі «Звязды», якая мае багатую інфармацыю на гэты конт.**

Але спачатку невялічкі экскурс у гісторыю. Перад намі два віды «Звязды»: орган Мінскага антыфашысцкага падполля (1941—1942 гады, Мінск) і орган Мінскага партызанскага злучэння (1943—1944 гады, партызанская зона). Калі да другога ніякіх пытанняў не існавала, то першы зведаў ціск абвінавачванняў з-за падазрэння ў здрадзе шэрагу мінскіх падпольшчыкаў. Аб гэтым ведаў і тагачасны начальнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху, першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка. Ён здагадваўся, што органы НКУС (па прычыне гэтай падазронасці) рыхтуюцца арыштаваць не толькі выдаўцоў, але і газету. Панцеляймон Кандратавіч захаваў ад органаў НКУС усе чатыры нумары падпольнай «Звязды». Даставіў іх у Маскву глыбокай восенню 1942 года адзін з актыўных выдаўцоў газеты, мінскі падпольшчык Уладзімір Казачонак. У будучым яны сталі адпраўной кропкай вяртання праўды аб мінчанах-падпольшчыках.

Незабыўны студзень 1943 года. Менавіта тады ў Любанскі раён Мінскай вобласці, на востраў Зыслаў, прыляцеў самалёт «Дуглас». Ён даставіў у глыбокі тыл ворага будучага рэдактара «Звязды» Міхаіла Парфёнавіча Барашкава і прымітыўнае, але працаздольнае абсталяванне друкарні. Іншыя рабочыя месцы ў «Звяздзе» занялі рэдактар Любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец і супрацоўнікі Капаткевіцкай раённай газеты. 27 студзеня 1943 года, у 585-ы дзень вайны, выйшаў першы нумар лясной «Звязды». Набіралі яго Ніна Цылько, Мікола Курыка, друкаваў газету Ілья Шурпач.

Усяго на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі ўбачыli свет 114 нумароў «Звязды», звяздоўцамі было выпушчана і 9000 лістовак. Але не абышлося без непрадбачаных сітуацый. 21 лютага 1944 года памёр ад недалечанай баявой раны Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў, які карыстаўся аўтарытэтам сярод партызанскіх камандзіраў. (Яго месца заняў адказны сакратар газеты Георгій Шчарбатаў.) Пастановай ЦК КП(б)Б адказным рэдактарам «Звязды» ў жніўні 1944 года быў зацверджаны В. Е. Самуцін. Спадарожніцу «Звязды», газету «Чырвоная змена», у сакавіку 1944 года ўзначаліў Іван Аляксандравіч Матыль, ураджэнец вёскі Дубровская Коханаўскага раёна Віцебскай вобласці. Выпускнік Аршанскага педвучылішча (1932 год) і Мінскага інстытута журналістыкі (1941 год). У пачатку вайны — арганізатар Магілёўскай абласной падпольнай камсамольскай арганізацыі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Вялікай Айчыннай вайны», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне». Па ўспамінах блізкіх, быў рамантыкам, але ад зямлі не адрываўся. Рэдактарам «Чырвонкі» працаваў нейкі час і пасля заканчэння вайны.

«Звязда» вярталася ў Мінск разам з першымі савецкімі войскамі — вызваліцелямі. Гэта былі ў асноўным танкісты. Забягаючы наперад, некалькі слоў аб наступным. У даваенны перыяд у Слуцку, родным горадзе маіх бацькоў, размяшчаліся кавалерысты на чале з савецкім палкаводцам Г. К. Жукавым. Да 1939 года Слуцк лічыўся кардонным, пагранічным горадам. Людзі не мелі пашпартоў, а толькі даведкі аб месцы пражывання. З-за гэтай прычыны ў многіх адсутнічалі нават дакументы аб рэгістрацыі шлюбу. У 1944—1945 гадах тут былі адкрыты дванаццаць новых ваенных гарадкоў, у якіх неслі службу, амаль да 60-х гадоў, танкавыя падраздзяленні, што мелі вопыт баявых дзеянняў у час Вялікай Айчыннай вайны.

Мінская прапіска «Звязды» як органа ЦК КП(б)Б, Савета Народных Камісараў і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аднавілася 10 ліпеня 1944 года. Планавалася зрабіць гэта 1 чэрвеня 1944 года, але перашкодзіў перанос пачатку аперацыі «Баграціён» на больш позні тэрмін.

Першы мірны штатны расклад «Звязды» падпісалі В. Е. Самуцін — ад рэдакцыі і Павесьма (ініцыялы ў дакуменце адсутнічаюць) — ад выдавецтва. Да старых аддзелаў дабавіліся аддзел заходніх абласцей і аддзел прапаганды марксізму-ленінізму.

9 мая 1945 года са старонак «Звязды» паслалі шчырае прывітанне суайчыннікам віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР В. А. Лявонаў, народныя артысты СССР Е. А. Міровіч, Г. Ю. Грыгоніс, Л. М. Літвінаў, С. С. Бірыла, пісьменнік Кандрат Крапіва; ад імя партызан і падпольшчыкаў з прывітальным словам звярнуўся Герой Савецкага Саюза, былы камандзір Мінскага партызанскага злучэння В. І. Казлоў.

Уяўленне аб тых днях дае і зварот кіраўнікоў Мінскага абласнога і Мінскага гарадскога Саветаў да ўрада БССР аб распачынанні хадайніцтва перад урадам СССР аб прысваенні Мінску ганаровага звання «Горад-герой» «за значны ўклад у арганізацыю і развіццё партызанскага руху ў Беларусі». Але гэта хадайніцтва па падказцы адказных работнікаў ЦК ВКП(б) (Г. М. Маленкова) засталося ў Мінску да 26 чэрвеня 1974 года. (Дата прысваення Мінску ганаровага звання «Горад-герой»). Прычына: існаванне таго самага абвінавачваючага ўхілу ў дачыненні да першага перыяду гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля.

Імя Г. М. Маленкова праходзіць і ў іншых матэрыялах архіва. У 1945 годзе па-за межамі дзяржаўнай дапамогі аказалася 1647 дзяцей-сірот. Многія з іх знаходзіліся ў стане батракоў ці падсобнай рабочай сілы, не атрымлівалі неабходнага выхавання, адукацыі. У маі—чэрвені 1945 года дзеці-сіроты былі ўзяты на ўлік раённымі, гарадскімі, абласнымі органамі ўлады. І тым не менш урад Беларусі папрасіў свайго куратара, сакратара ЦК ВКП(б) Г. М. Маленкова дадаткова выдзеліць 40 000 камплектаў дзіцячай бялізны і 10 000 пар абутку. Масква просьбу задаволіла. У Мінску, абласных цэнтрах рэспублікі пачалі дзейнічаць спецыяльныя сталовыя, магазіны для атаварвання дзіцячых харчовых картак, павялічылася колькасць пуцёвак у піянерскія лагеры, дзіцячыя санаторыі. Праблема знаходзілася на рабочых сталах многіх устаноў, у тым ліку і сродкаў масавай інфармацыі, да яе поўнага вырашэння.



1418 дзён Вялікай Айчыннай вайны...

У 1947 годзе «Звязда» адзначыла 30-годдзе свайго нараджэння. Знайшлося месца і для «Звязды»-падпольшчыцы». Былі ўзгаданыя імёны загінулых друкароў: М. П. Воранава, М. М. Воранава, А. С. Грышына, М. І. Свірыдава, В. В. Тарашкевіча. Але, на жаль, сваточны матэрыял не поўна раскрыў ролю гарадскога падполля ў стварэнні ў Беларусі шырокага партызанскага руху. Адна з прычын — недастатковая вывучанасць падпольнай дзейнасці гараджан не толькі ў Мінску, але і ў Магілёве, Брэсце, Віцебску, Оршы, Барысаве і ў іншых гарадах.

«Звяздзе» пашанцавала з кіраўніком Беларускай ССР — Панцеляймонам Кандратавічам Панамарэнкам. (Ён, па ўспамінах некаторых дзеячаў, нават разглядаўся І. В. Сталіным у ролі свайго пераемніка. Але раптоўная смерць кіраўніка СССР у пачатку 50-х гадоў парушыла ўсе планы, нарадзіла « на самым версе», у Маскве, шматлікіх ворагаў П. К. Панамарэнкі з ліку зайздрослівых.)

Урад Панцеляймона Кандратавіча павінен быў аднавіць дзейнасць 192 газет (9 рэспубліканскіх, 11 абласных, 10 гарадскіх, 162 раённых). Для выканання наменчанага не хапала высокакваліфікаваных спецыялістаў, сродкаў сувязі, транспарту, рабочых памяшканняў. У «Звяздзе» засталіся без загадчыкаў сем аддзелаў, у «Савецкай Беларусі» — восем. Але ўжо ў снежні 1944 года ўрад БССР і ЦК КП(б)Б прынялі сумесную пастанову «Аб аднаўленні паліграфічнай прамысловасці БССР», у якой, у прыватнасці, гаварылася: «Прасіць СНК СССР і ЦК ВКП(б) выдзеліць у першым квартале 1945 года Беларускай ССР наступнае паліграфічнае абсталяванне...» (і далей ішоў працяглы пералік неабходных рэчаў).

У 1946 годзе «Звязда» разам з іншымі друкаванымі органамі пераехала на вуліцу Пушкіна, у дом, які знаходзіўся побач з друкарняй імя Сталіна.

З успамінаў першага пасляваеннага старшыні Мінскага гарвыканкама К. І. Бударына: «Сюды (у Мінск. — **Аўт.**) я прыехаў 3 ліпеня з аператыўнай групай гаркама і абкама. Мы сустрэлі страшэнную забруджанасць Мінска: трупы людзей і коней, пажары. Насельніцтва ў цэнтральнай частцы горада амаль не было. На ўскраінах насельніцтва захавалася. Потым пачалі вяртацца людзі з вёсак, лясоў. Мы правялі першапачатковы перапіс. У нас атрымалася 103 тысячы чалавек». (У 1939 годзе ў Мінску пражывала 238 тысяч чалавек. — **Аўт.**)

У вызваленым Мінску з 332 існаваўшых да вайны прамысловых прадпрыемстваў не былі разбураны 19: радыёзавод, скурагалантарэйная фабрыка імя Куйбышава, друкарня імя Сталіна, піваварны завод, 1-я, 2-я, 3-я бальніцы, гарбарны завод «Бальшавік», спіртагарэлачны завод, дрожджавы завод «Чырвоны сцяг», завод імя Варашылава і інш.

Грамадскія будынкі, якія захаваліся: Дом ЦК КП(б)Б (новы), Дом Урада, 1-я савецкая гасцініца (па Камсамольскай вуліцы), Драматычны тэатр, Дом Чырвонай Арміі, Оперны тэатр (часткова разбураны ўнутры).

У кастрычніку 1947 года беларускі рэспубліканскі друк падвергнуўся крытыцы з боку ідэалагічнай камісіі ЦК КП(б)Б «за слабае выкрыццё рабалепства перад замежжам», «за заніжэнне работы па выхаванні ў насельніцтва высокага пачуцця рэвалюцыйнай пільнасці». Прычына крытыкі зыходзіла з артыкулаў у «Правде» і «Литературной газете» аб нібыта не патрыятычным вучнку беларускага біёлага, акадэміка АН БССР А. Р. Жэбрака. Шырока вядомы даследчык у свой час быў у Злучаных Штатах Амерыкі на практыцы. Вярнуўшыся, станоўча адазваўся аб амерыканскай школе генетыкаў і некалькі крытычна аб працах ў гэтай сферы савецкага біёлага, агранома Т. Дз. Лысенка (тройчы лаўрэата Сталінскіх прэмій: у 1941, 1943, 1949 гадах). У адказ на заўвагі «Звязда» перадрукавала названыя вышэй артыкулы і тым абмежавалася.

Газета і сама была крытычнай. Толькі ў 1945 годзе яна падвергла крытыцы за бюракратызм, ідэалагічныя пралікі, разбазарванне матэрыяльных сродкаў Мінскі гаркам КП(б)Б, Віцебскі абкам КП(б)Б, пракуратуру Мінска, Міністэрства мясцовай прамысловасці і іншыя арганізацыі і ўстановы. Заўвагі былі ўспрыняты з разуменнем.

А як жылі ў тыя дні простыя людзі, шматлікія чытачы «Звязды»? Пэўны адказ на пытанне дае пісьмо медыцынскага работніка А. Е. Аляксеева на імя наркама земляробства СССР А. А. Андрэева — наконт яго паездкі ў шэраг раёнаў Беларускага Палесся. Прыводзім частку напісанага: «Яшчэ на шляху ад Мінска да станцыі Янаў-Палескі я назіраў на кожнай станцыі штабелі мяшкоў з бульбай і хлебам (мука, зерне), а ля мяшкоў мноства людзей — гаспадароў гэтых мяшкоў. Хто яны? Адкуль яны? Я цікавіўся, і амаль на кожнай станцыі, дзе б я ні спытаў, паўсюдна пераважная большасць іх — палескія калгаснікі (Палеская вобласць БССР). Калгаснікі Палескай вобласці, галоўным чынам з Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў, галадаюць і выехалі, каб выратавацца ад галоднай смерці дзяцей і старых... А ў тыле ёсць бюракраты — манекены, якія жадаюць на няшчасці гэтых людзей нажыць сабе матэрыяльныя даброты, яны са скуры вылузваюцца, каб даказаць, што гэтыя жанчыны і старыя не болей як спекулянты, і адбіраюць у галоднай жанчыны і дзяцей апошнюю надзею на выратаванне ад голаду...»

Мяркуючы па знешніх прыкметах, пісьмо было разгледжана ўрадам БССР і ЦК КП(б)Б. Але інфармацыі аб прынятыц канкрэтных мер, на жаль, няма.

Такім было вяртанне «Звязды» да мірнага жыцця. За плячыма газеты засталіся 1418 дзён Вялікай Айчыннай вайны.

**Яўген БАРАНОЎСКІ,**
**кандыдат гістарычных навук**



За круглым сталом Берлінскай (Патсдамскай) канферэнцыі. Ліпень 1945 года. Іосіф Сталін (СССР), Гары Трумэн (ЗША), Уінстан Чэрчыль (Вялікабрытанія) будуюць новую пасляваенную Еўропу.

■ Жыццёвінкі

# СВАЁ — НЕ ЧУЖОЕ

## ЛЮБІМАЕ «ДЗІЦЯ»

Вечаровая пара. Натомленыя за дзень суседкі Вольга Пятроўна і Ніна Сцяпанаўна сядзяць на лаве перад парканчыкам, пра жыццё баяць. Няма дажджу, і гэта асабліва непакоіць вясковых бабуль: калі градкі яшчэ можна паліць калодзежнай вадой, так-сяк ратаваць іх, то на бульбу ні сілы, ні вады не хопіць — абавязкова дождж патрэбны. А дзе ён, небарака?

— А чаму гэта, маладзіца, пустазелле і паліваць не трэба, а яно вунь як прэ?! — цікавіцца Вольга Пятроўна ў Ніны Сцяпанаўны. — Глянь вунь... Павярні галаву...

— Ды я ж хіба не бачу? Навошта галавой круціць? А сапраўды, чаго ж так?

Пэўны час старыя маўчаць. Вольга Пятроўна нарэшце парушае маўчанне:

— Таму, відаць, што пустазелле сама зямля пасадзіла, а не мы з табой. А якая ж маці сваё дзіця пакрыўдзіць?..

## ДЗЯКУЙ ЖОНЦЫ

Санаторый. Першая палова дня. Вяртаемся з жонкай з працэдур. Прыбіральшчыца толькі што памыла падлогу ў нашым пакойчыку, выпрасталася, зняла анучу са швабры, прыветна нам усміхнулася і сказала:

— Вялікі дзякуй за парадак, што падтрымліваеце ў пакойчыку. Я наогул люблю сямейныя пары. У нас тут некалі, вы паслухайце толькі, жыў адзін дзядок. Яму было — не паверыце! — дзевяноста два гады. Пахваліла і яго за парадак. Малайчына, дзядуля, кажу. А ён заяўляе бадзёра так: «Гэта не мне трэба дзякуй казаць, а маёй жонцы. Яна прывучыла мяне да парадку». — «Якім чынам, цікава?» — «А вельмі проста... У першыя дні, як толькі пабраліся шлюбам, шкарпэткі ці кашулю кіну абы дзе ў пакоі ці абутак не там пастаўлю, — яна тыдзень са мной не размаўляе. Карміць карміла, хлусіць не буду. Але падавала ежу на стол як чужому. Ага, думаю, трэба перараблівацца...» Я ўсміхнулася старому пасля пачутага і папрасіла перадаць словы падзякі сваёй бабулі.

— Абавязкова перадам, — сур'ёзна паабяцаў дзядуля. — Чаму ж не перадаць, калі яна гэта заслужыла?

## ХАТА НЕ ПУСКАЕ

Ігнат дажывае век адзін. Дзеці ў горадзе, жонка гадоў колькі таму адышла ў іншы свет. Кажуць, неяк прыехаў да яго малодшы сын Пятро з адным жаданнем — забраць нарэшце бацьку да сябе ў горад, усё ж лягчэй там будзе яму. Чаму нарэшце? Ды браліся за гэтую справу дзеці не адзін ужо раз, а толькі нічога не атрымалася. «Едзьце, адкуль прыехалі! Як гэта я сваю хату пакіну? Не смяшыце людзей», — аднекваўся стары. Сілком жа яго і сапраўды не пацягнеш — не дзіця.

А тут Пятро паабяцаў сваім братам Мікалаю і Сцяпану, што без бацькі не прыедзе. Збірайце на стол і сустракайце. Пастаўлю бацьку ўмову: не паедзеш, скажу, ты, не паеду і я. Сяду на парозе і буду сядзець. Хоць дзень, хоць два...

Пятро, ледзьве пераступіўшы парог, заявіў старому пра мэту візіту. А Ігнат сваё:

— Не паеду, хлопцы. Вы лепш мне дроў назапасьце... А вады вядзерца як-небудзь прынясу. Тым больш што я ўжо свой багаж упакаваў і адправіў...

— Куды? Які багаж? — здзівіўся Пятро.

— А туды... — Ігнат махнуў у бой могілак. — У ім тры інфаркты... Артроз з артрытам... І рэўматызм...

## ЯК ЖЫВАЯ

Бабы Дуні даўно няма ўжо. Бываючы на вясковых могілках, падыходжу і да яе. Углядаюся ў выяву старой — як жывая на гранітнай пліце. І быццам чую яе голас — прыглушана-хрыплаваты, нетаропкі:

— Як толькі сышоў снег, падсохла зямля, смецце каля двара зграбла ў кучкі, а потым знесла ў адну бліжэй да дарогі, там можна спаліць — пясок, а пабудовы далёка. Спаліла, значыць, смецце, а потым у краму пабегла. Набрала ўсяго, а тады — цап: няма грошай. Добра ж помню, што ў кішэні былі. Мо дома, думаю? Пабегла — і дома няма. Куды ж яны падзеліся, халера? Увесь вечар маракавала, і толькі тады да мяне дайшло — грошы, пэўна ж, вылецелі з кішэні, і я іх разам са смеццем зграбла і спаліла, сляпая цяцера. Перажывала, вядома ж. А потым супакоілася: гэта ж Бог мяне пакараў. За што, пытаешся? Якраз перад гэтым я купіла ў Шуры кавалак сала, які ён сцягнуў з-пад пільнага вока жонкі, а грошы, вядома ж, прапіў. Не трэба было мне гэтага рабіць. Грэх. Вось ён і пакараў мяне...

## КАСІ, КАСА!

Аляксей Максімавіч трапіў у бальніцу: сэрца. Ужо другі тыдзень тут. Крыху ачуняў, пачувае сябе лепей. Пасля кропельніцы да абеда быў вольны ад працэдур час, і ён прылёг на ложак. «Мо пасплю хоць трохі, бо ноччу, лічы, так і не самкнуў вачэй: бяссонніца». І толькі, здаецца, правальўся некуды ў небыццё, як акном рэдзенька затарахцеў маторчык. Здагадаўся: касьбар. Ён ужо бачыў гэтага хлапца, які ўшчыльніўся так, што не толькі ў рот і нос, але і на цела не трапіць пылок ад травы. Ужо трэці дзень ён косіць. «Зламаўся б ты ці што, хлопча», — нялюба падумаў пра касца, які перашкаджаў яму спаць, Аляксей Максімавіч.

Відаць, у работніка быў перакур, і бензапіла некалькі хвілін маўчала. А потым зноў — гыр ды гыр! Ну дзе тут заснеш! Ат!..

І стары ўспомніў вёску, сваю касу-літоўку — «сямёрачку». Лёгенькая, востранькая — касіць ёю проста цуд! Ды і мелодыя яе — джык-джык — сэрцу люба, не тое што гэтая малатарня. Разважаў: «Бо тая — свая, зямная, гэтая ж — нейкая чужая...»

Лежачы, Аляксей Максімавіч цвёрда рашыў — калі вернецца, адклепле як след малаточкам сваю «сямёрачку» і абавязкова пакосіць. Абавязкова. Хоць карову ўжо і не трымае, а проста так. Для душы. «Эх, — думаў стары, — калі б і гэтаму хлапцу даць паслухаць, як хораша спявае мая каса! Шкада — не атрымаецца. Я б яму, блазнюку, пазаваў, як касіць трэба, а не гыркаць!..»

Але калі ў пакой уплываў пах свежаскошанага сена, твар у старога ўсё роўна лагаднеў...

## КАРЫСНАЯ СПРАВА

Юрка, малодшы Ягораў сын, учора патэлефанаваў бацьку ў вёску і адразу ж, ледзь павітаўшыся, папрасіў:

— Тата, горад гармонь просіць! Пра вёску, тата!.. Нашу, любімую!.. Хутчэй, хутчэй!..

Ягор моўчкі, бы пад нейкім гіпнозам, узяў гармонік, сеў на зэдлік, мабільнік паклаў на табурэт перад сабой і расцягнуў мяхі...

Выканаў заказ, паднёс мабільнік да вуха, спытаў:

— Ці не хопіць, сын? Ды і чаму гэта табе раптам закарцела сярод белага дня песню паслухаць? Рабіць няма чаго?

Юрка не адказаў.

— Ты што там — плачаш? — Ягор узняўся з зэдліка, паставіў гармонік на стол. — Ну дзе ты?!

Сын і на гэты раз не адказаў, хоць быў на сувязі. «Ён, што, — п'яны, можа? Дык быццам не — голас не выдае. А чаму ж тады маўчыць?»

Папытаў больш строга:

— Ты куды там падзеўся?! Дай яму гармонь, а сам — маўчок?

І раптам пачуў сынаў голас, радасны, шчаслівы:

— Усё, тата! Запісалі! Дзякуй! Падчысцім трохі, і будзе добра. Гэта ж мы ў народным тэатры спектакль ставім, і ў фінале патрэбна была песня пра вёску... Чым дзе бегаць і шукаць, дык я пра цябе ўспомніў... Яшчэ раз дзякуй, тата. Прывязём абавязкова спектакль з тваім гармонікам у вёску... Абяцаю!

«Каб жа сказаў, што для спектакля, дык я, можа, сыграў бы лепш», — пашкадаваў Ягор.

Але ад таго, што хоць нейкую карысную справу зрабіў сёння для людзей, радасна прытупнуў нагой і, усміхнуўшыся кату, які ляжаў на лаве і ўважліва сачыў за гаспадаром, жвава прапанаваў: «Ці не пара нам падсілкавацца, дружа? Бачыў жа сам — мы зарабілі!»

**Васіль ТКАЧОЎ**

■

# ШЧАСЦЕ Ў ЭФІРЫ

### Новае тэлевізійнае шоу для ўсёй сям'і стартуе на канале «Беларусь 1»

**Тэлеканал «Беларусь 1» распачынае тэлевізійны сезон 2017—2018 года новым праектам: 16 верасня адбудзецца прэм'ера народнага шоу «Шчаслівы вечар». Акцэнт праекта — на беларускай сям'і і яе творчых здольнасцях. Самыя таленавітыя ўдзельнікі праграмы атрымаюць не толькі сваю «хвіліну славы», але і карысныя прызы.**



У першым выпуску праекта гледачы ўбачаць творчыя нумары ад трох зорных сем'яў. Да выступлення ў эфіры гэтым разам рыхтаваліся тэлевядучыя Тэа і Вольга Рыжыкава, салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Алена Сіняўская з мужам Дзмітрыем, а таксама сямейная пара артыстаў Беларускага дзяржаўнага цырка Вячаслаў Быхан і Хрысціна Нус.

— Першы выпуск праграмы будзе дабрачынны. Падарункі, што зараз разыграюць, пойдуць на карысць людзям, якія маюць у іх патрэбу, — расказала перад пачаткам здымак «Шчаслівага вечара» тэлевядучая Вольга Рыжыкава. — Сёння няма нездаровай канкурэнцыі, ёсць толькі здаровае жаданне ўсміхацца і праявіць сябе, каб дапамагчы калегам стварыць новае шоу: вялікаму праекту папярэднічае вялікая праца ўсёй каманды. Мы вельмі рады за Белтэлерадыёкампанію, якая нарэшце запусціла «Шчаслівы вечар».

Удзельнікі наступных эфіраў «Шчаслівага вечара» пачнуць спаборнічаць за прызы. Але тэлеканал не планує пакідаць канкурсантаў з падрыхтоўкай нумара сам-насам: да кожнай сям'і далучаць зорнага куратара, які будзе дапамагаць ім здзіўляць гледачоў. Выйсці на сцэну ў тэлестудыі канала «Беларусь 1» на Макаёнка, 9 цяпер можа кожны беларус — дастаткова ўважліва глядзець тэлевізар у дзень эфіру. Інструкцыя зусім не складаная: цягам трансляцыі канала трэба ўбачыць і запомніць 10 кодавых лічбаў. Першыя лічбы на «Беларусь 1» з'явіцца 16 верасня ў 18:55 падчас міжпраграмнага роліка. У гэтым роліку гледачы даведаюцца і нумар, па якім трэба тэлефанаваць, каб агучыць усе 10 лічбаў кода. Далей — больш складана: наступную частку кода трэба будзе чакаць у фільмах і праграмах. Апошнія лічбы агучаць у эфіры вячэрняй «Панарамы», а таксама вядучыя праекта Артур Шуляк і Марыя Багатыр у пілотным выпуску «Шчаслівага вечара». Калі прагучаць апошнія лічбы, трэба не марнаваць час, а хутчэй тэлефанаваць на тэлеканал: першая тройка беларусаў можа разлічваць на ўдзел у праекце. Паспелі? Рыхтуйцеся ехаць у студыю! Абмежаванняў амаль няма: узяць удзел у праграме можна незалежна ад узросту і творчых сіл, паклікаць на дапамогу членаў сям'і і сяброў, паказаць нумар на любы густ. Адзіная ўмова — на сцэне павінна з'явіцца не больш за пяць чалавек.



Пераможцу народнага шоу разам з прафесійным журы (дарэчы, таксама зорным!) будзе выбіраць уся краіна: прысуд творчым нумарам вынесуць і тэлегледачы, якія могуць уплываць на вынікі праграмы праз тэлефоннае і sms-галасаванне.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.**

**Фота з архіва Белтэлерадыёкампаніі**

■

# БАНКІ — ДЗЕЦЯМ

**На мінулым тыдні стартавала маштабная рэспубліканская акцыя «Белаграпрамбанка» па фінансавай адукаванасці «Твае першыя фінансы». Пачатак акцыі адзначаўся яркімі ўрачыстымі мерапрыемствамі для школьнікаў ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі.**



У Мінску супрацоўнікамі «Белаграпрамбанка» было арганізавана сапраўднае свята фінансавай адукаванасці ў сярэдняй школе №136. Кульмінацыяй мерапрыемства стала ўручэнне вучням пятых класаў маляўнічага ілюстраванага зборніка фінансавых апавяданняў на беларускай мове «Твае першыя фінансы» і іншых памятных прызоў і падарункаў ад банка. Навучэнцы гэтай школы прынялі актыўны ўдзел у віктарынах і конкурсах, праверылі свае веды па фінансавай адукаванасці, а таксама разам з супрацоўнікамі банка патрэніраваліся ў рашэнні эканамічных задач.

— Ідэя стварэння зборніка апавяданняў на фінансавую тэму для школьнікаў нарадзілася не выпадкова, — адзначыў на свяце **намеснік старшыні Праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» Сяргей ЧУГАЙ**. — Мы хацелі, каб вывучэнне фінансавай граматы было для дзяцей у першую чаргу цікавае і карыснае. Таму кніга «Твае першыя фінансы» напісана ў займальнай форме — у выглядзе жывых, цікавых, маляўніча ілюстраваных апавяданняў на фінансавую тэму. У ёй шмат карыснага для сябе можа знайсці нават дарослы чалавек. З дапамогай гэтага праекта мы хочам пakazаць, што банк адкрыты для падрастаючага пакалення і гатовы дапамагчы ў засваенні фінансавай навукі. Сёння часцяком па ўзроўні фінансавай адукаванасці чалавека мяркуюць аб яго прафесіяналізме, узроўні агульнага развіцця. Наша задача — дапамагчы дзецям стаць яшчэ больш развітымі і адукаванымі ў фінансавым плане, і як вынік, паспяховымі і ўпэўненымі ў сабе.

__Даведка.__ *У 2017 годзе праекту «Белаграпрамбанка» «Твае першыя фінансы» споўнілася чатыры гады. За гэты час банк наведаў сотні школ па ўсёй краіне, правёў мноства ўрокаў па фінансавай адукаванасці і ўручыў тысячам пяцікласнікаў брашуры на фінансавую тэму. Акрамя таго, «Белаграпрамбанк» з'яўляецца актыўным удзельнікам Тыдня фінансавай адукаванасці дзяцей і моладзі, які штогод праводзіцца ў нашай краіне. Так, у 2016 годзе банк правёў для дзяцей па ўсёй Беларусі больш за 300 мерапрыемстваў, у іх прыняло ўдзел больш за 11 тысяч чалавек.*

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# НЕПРЫКАЯНЫЯ РАХІНДЖА

## Што адбываецца ў М'янме?

**Сітуацыя ў М'янме застаецца ў цэнтры ўвагі сусветнай супольнасці. Напрыканцы жніўня ўрадавыя войскі пачалі поўнамаштабную аперацыю ў адным са штатаў супраць баевікоў руху «Армія вызвалення Аракан рахінджа» (ARSA). Яго кіраўніцтва краіны лічыць тэрарыстычнай арганізацыяй. Дзеянні ўладаў сталі адказам на напад баевікоў на паліцэйскія пасты і вайсковую базу. Падчас сутыкненняў ужо загінула больш чым 400 чалавек. Колькасць мусульман-рахінджа, якія ратуюцца ад гвалту ў М'янме і шукаюць прытулку ў суседняй Бангладэш, паводле розных ацэнак, перавысіла 370 тысяч. Генеральны сакратар ААН Антоніа Гутэрыш выказаў сваю занепакоенасць Савету Бяспекі, прапанаваўшы розныя крокі для спынення гвалту. Наконт неабходнасці ўрэгулявання сітуацыі выказаліся лідары шэрагу дзяржаў. У асобных краінах з мусульманскім насельніцтвам адбыліся мітынгі ў падтрымку рахінджа. А вось дзяржаўны саветнік і міністр замежных спраў М'янмы Аун Сан Су Чжы, якая фактычна з'яўляецца палітычным лідарам краіны, заявіла аб «масавай дэзынфармацыі» вакол падзей у рэспубліцы. Што ж адбываецца ў гэтай краіне?**



### 7 правінцый і 7 штатаў

Пераважна населеная будыстамі М'янма толькі нядаўна пазбавілася ад дыктатарскай улады ваенных, якія кіравалі краінай з 1962 года. Краіну дзесяцігоддзямі раздзіраюць разнастайныя міжнацыянальныя, палітычныя, крымінальныя і рэлігійныя канфлікты. Гэта заблытанае супрацьстаянне дзясяткаў бакоў, у якім сышліся партызанскія і падпольныя рухі, ваенна-палітычныя сілы, якія аказваюць уплыў з Кітая, Індыі, Тайланда, сепаратысцкія рухі нацыянальных меншасцяў і злачынныя групоўкі, якія кантралююць вытворчасць і збыт опіуму і наркотыкаў, што вырабляюцца з яго, — значная частка тэрыторыі М'янмы знаходзіцца ў межах знакамітага «залатога трохвугольніка».

Рэспубліка Саюз М'янма, як цяпер афіцыйна называецца гэтая дзяржава, складаецца з сямі правінцый, населеных уласна бірманцамі, «бама», і сямі нацыянальных штатаў, ні адзін з якіх у рэальнасці ніколі не прызнаваў улады цэнтральнага ўрада. Насяляюць іх народы і разнастайныя мясцовыя палітычныя і крымінальныя аб'яднанні, якія заўсёды вялі супраць сталіцы і супраць адзін аднаго сваё грамадзянскія войны. Праўда, апошнім часам з усімі штатамі фармальна дасягнута пагадненне аб спыненні агню. Сыходзячы з М'янмы, якая тады звалася Брытанскай Бірмай, у 40-я гады XX стагоддзя брытанская каланіяльная адміністрацыя паабяцала даць незалежнасць амаль усім нацыянальным ускраінам, што збольшага і стала прычынай наступных канфліктаў, паколькі зроблена гэтага не было.

У ліку дзяржаў, якія не адбыліся, і нацыянальны штат Ракхайн ці Аракан — вузкая паласа зямлі на бірманскім узбярэжжы Бенгальскага заліва, на крайнім захадзе мяжуе з Бангладэш. Менавіта Ракхайн і з'яўляецца радзімай паўтарамільённага мусульманскага народа рахінджа — па іх уласным меркаванні. Улады ж М'янмы так не лічаць, называючы ўвесь гэты этнас «незаконнымі мігрантамі», а таксама «ісламскімі баевікамі», якіх падтрымліваюць міжнародныя тэрарыстычныя сеткі і «некаторыя мусульманскія манархіі Персідскага заліва». Узброены канфлікт з рахінджа абвастрыўся 9 кастрычніка 2016 года, а затым яшчэ мацней —- сёлета 25 жніўня, калі байцы мясцовай нешматлікай узброенай групоўкі «Армія вызвалення Аракан рахінджа», якая сапраўды абвяшчае ісламісцкія лозунгі, напалі адразу на 30 армейскіх аб'ектаў і паліцэйскіх участкаў, забіўшы 15 чалавек у якасці «акта помсты» за пераслед сваіх суайчыннікаў. У адказ пачалася ваенная «акцыя помсты», якую міжнародныя праваабарончыя арганізацыі называюць генацыдам усяго мусульманскага насельніцтва штата Ракхайн, дзе іслам вызнаюць, дарэчы, не толькі рахінджа. Як сцвярджаюць СМІ, па падазрэнні ў «тэрарызме» арыштаваныя сотні чалавек, у тым ліку 82-гадовы стары і 13-гадовы падлетак. Афіцыйныя ўлады па стане на 1 верасня заявілі аб прыкладна 400 знішчаных «паўстанцах» і толькі 17 «выпадкова загінулых» мірных жыхарах. Аднак мірныя рахінджа, якія здолелі па джунглях і рэках перапраўіцца ў Бангладэш і іншыя дзяржавы рэгіёна, расказваюць пра тысячы забітых аднавяскоўцаў, знішчэнні і падпал іх вёсак, зверствы, катаванні і групавыя згвалтаванні, якія масава здзяйсняюцца салдатамі і паліцэйскімі ў іх родных краях.

### Новыя гульцы

М'янма, найбуйнейшая па плошчы (678 тыс. кв. км) кантынентальная дзяржава Паўднёва-Усходняй Азіі, якая знаходзіцца на скрыжаванні стратэгічных інтарэсаў рэгіянальных «палюсоў сілы» — Кітая, Індыі і АСЕАН, застаецца закладніцай застарэлага канфлікту з мусульманскай меншасцю. На думку экспертаў, гэтая краіна — складаны кангламерат народнасцяў, але ўсіх іх аб'ядноўвае агульная бірманская гісторыя і дзяржаўнасць. Рахінджа выпадаюць з гэтай сістэмы супольнасцяў, і менавіта ў гэтым зерне канфлікту, у выніку якога гінуць і мусульмане, і будысты. Існуе некалькі гістарычных тэорый, якія па-рознаму тлумачаць з'яўленне рахінджа ў М'янме. Самі прадстаўнікі названага народа лічаць сябе карэнным насельніцтвам штата Ракхайн, збольшага нашчадкамі арабаў, якія каланізавалі ўзбярэжжа Індыйскага акіяна ў Сярэднявеччы. І сапраўды, у мове рахінджа шмат запазычанняў з санскрыту, арабскай, персідскай і нават партугальскай моў. Аднак мясцовыя будысты і ўлады М'янмы сцвярджаюць, што насамрэч рахінджа — гэта этнічныя бенгальцы-мусульмане, калісьці перасяленыя на ўсход брытанскімі каланіяльнымі ўладамі з тэрыторыі цяперашняй Бангладэш у якасці таннай працоўнай сілы, а таксама бежанцы адтуль падчас вайны за незалежнасць гэтай тэрыторыі ад Пакістана ў 1971 годзе.

Некаторыя навукоўцы нагадваюць таксама, што ўзаемную нянавісць паміж будыстамі і мусульманамі ў гэтай частцы М'янмы асабліва падагрэлі падзеі Другой сусветнай вайны, калі Брытанская Бірма была захоплена Японіяй. Мусульмане-рахінджа засталіся на баку брытанцаў і пачалі партызанскую барацьбу. Мясцовыя ж будысты ў штаце Ракхайн падтрымалі японскіх акупантаў, якія паабяцалі даць краіне незалежнасць, і пачалі масава ўступаць у «Нацыянальную армію Бірмы», якая ваявала на баку Токіа. На чале гэтага войска стаяў генерал Аун Сан, адзін з заснавальнікаў Камуністычнай партыі Бірмы, — бацька Аун Сан Су Чжы, якая цяпер узначальвае краіну.

Магчыма, рахінджа ў такой сітуацыі і пакінулі б краіну, аднак «родная» Бангладэш проста не ў стане прыняць такую колькасць перасяленцаў. Чаму? Паколькі з'яўляецца адной з самых бедных і перанаселеных краін свету — у дзяржаве плошчай 147,5 тыс. кв. км (нагадаю, для параўнання, што плошча Беларусі складае 207,6 тыс. кв. км) жыве амаль 170 мільёнаў чалавек. Лагеры бежанцаў там перапоўненыя. Нядаўна бангладэшскія чыноўнікі вярнуліся да старой ідэі — пасяліць іх на амаль незаселеным і фактычна некантралюемым востраве Тэнгар Чар, які мае дрэнную славу прыстанішча піратаў і кантрабандыстаў, дзе няма ніякай інфраструктуры. Цяпер, у сезон дажджоў, востраў амаль цалкам схаваны пад вадой. Гэта выклікала абурэнне праваабаронцаў і шэрагу сусветных палітыкаў. Ёсць «раскладка» і па іншых суседніх краінах. Так, у Малайзіі ўжо знаходзяцца не менш за 120 тысяч бежанцаў з М'янмы. 40 тысяч рахінджа плануюць выслаць улады Індыі, нягледзячы на тое што ААН прызнала частку з іх бежанцамі. Прадстаўнік індыйскага ўрада заявіў, што ўсе рахінджа знаходзяцца ў краіне нелегальна. ААН падкрэслівае, што міжнароднае права забараняе высылаць бежанцаў у краіну, дзе ім можа пагражаць небяспека. Аднак урад Індыі кажа, што краіна не падпісала канвенцыю аб статусе бежанцаў і ўсе нелегальныя імігранты будуць дэпартаваныя.

Паводле розных ацэнак, да мільёна рахінджа дагэтуль застаецца на тэрыторыі М'янмы. Пазбаўленыя грамадзянскіх правоў, працоўных магчымасцяў, пражываючы ў найбяднейшым штаце краіны, яны яшчэ больш радыкалізуюцца. «Армія вызвалення Аракан рахінджа « (іншая назва — «Аракан аль-Якін» ці «рух веры») упершыню заявіла пра сябе ў кастрычніку 2016 года, калі яе баевікі ўчынілі напад на паліцэйскія ўчасткі, забіўшы дзявяцярых супрацоўнікаў. Групоўка сцвярджае, што яе мэта — «пабудова дэмакратычнай ісламскай дзяржавы для народа рахінджа, абарона этнічнай меншасці рахінджа ад рэпрэсій з боку м'янманскіх уладаў». А тыя ў сваю чаргу сцвярджаюць, што гэта тэрарыстычная арганізацыя, чые лідары атрымалі падрыхтоўку ў трэніровачных лагерах за мяжой. Паводле звестак «Міжнароднай антыкрызіснай групы», яе лідарам з'яўляецца Ата Ула, прадстаўнік народнасці рахінджа, які нарадзіўся ў Пакістане, але вырас у Саудаўскай Аравіі, дзе атрымаў рэлігійную адукацыю ў Мецы, і дагэтуль падтрымлівае цесныя сувязі з гэтай краінай. Аднак прадстаўнік «Арміі вызвалення Аракан рахінджа» ў інтэрв'ю выданню Asia Times заявіў, што ў яе няма сувязяў з джыхадысцкімі групоўкамі, яе членамі з'яўляюцца маладыя мужчыны народнасці рахінджа, засмучаныя тым, як стала развівацца сітуацыя пасля сутыкненняў 2012 года. Тады падчас успышкі міжрэлігійнага насілля паміж будыйскім насельніцтвам штата і, як



мяркуюць, мусульманамі-рахінджа больш за 100 тысяч мусульман аказаліся без прытулку, дзясяткі тысяч мусульман-рахінджа дагэтуль знаходзяцца ў часовых лагерах, адкуль ім не дазваляюць выязджаць. Прычынай канфлікту стала згвалтаванне і забойства маладой дзяўчыны з будыйскай сям'і.

Між тым Міжнародная антыкрызісная група паказвае ў сваёй справаздачы аб сітуацыі ў штаце Ракхайн напрыканцы мінулага года: «З'яўленне гэтай добра арганізаванай, і, відаць, добра фінансуемай групоўкі цалкам змяняе сітуацыю ў тым, што датычыцца спроб уладаў М'янмы справіцца са складанымі праблемамі штата Ракхайн, якія ўключаюць у сябе даўнюю дыскрымінацыю супраць мусульманскага насельніцтва, адмову ў правах і грамадзянстве». Па звестках уладаў, якія спасылаліся на інфармацыю, атрыманую ад мясцовых жыхароў, яшчэ за некалькі месяцаў да ўспышкі насілля пасланнікі ARSA пачалі рэкрутаваць сотні маладых мужчын з мусульманскіх вёсак, якія пасля праходзілі падрыхтоўку за мяжой. Цяпер доступ журналістаў у гэтую правінцыю вельмі абмежаваны, таму цяжка пацвердзіць або абвергнуць канкрэтныя лічбы. Праваабарончая арганізацыя «Х'юман Райтс Уоч», абапіраючыся на спадарожнікавыя фатаграфіі, заяўляе, што хваляванні ахапілі па меншай меры 10 раёнаў.

### Дачка генерала

Аун Сан Су Чжы, якая фактычна ўзначальвае дзяржаву, доўгія гады змагалася за дэмакратызацыю ў краіне, дзе панаваў ваенны рэжым. Яна — дачка генерала Аун Сана, заснавальніка Бірмы. У 1947-м, напярэдадні абвяшчэння незалежнасці ад Брытаніі, Аун Сан, які ўзначальваў тады пераходную адміністрацыю краіны, быў забіты пры спробе дзяржаўнага перавароту, калі яго дачцэ было ўсяго два гады. Дзяўчынку выхоўвала маці, якая спачатку працавала ва ўрадзе, а потым стала дыпламатам. Аун скончыла каледж у Індыі, потым атрымала ступень бакалаўра па палiталогіі і эканоміцы ў Оксфардзе, працавала ў ААН, пераехала ў Англію, абараніла доктарскую, нарадзіла двух сыноў.

Калі ў 1988 годзе яна паехала ў Бірму наведаць сваю хворую маці, у краіне ўспыхнулі студэнцкія хваляванні, якія перараслі ў паўстанне супраць хунты. Аун далучылася да паўстанцаў, 26 жніўня ўпершыню ў жыцці выступіла на мітынгу, а ўжо ў верасні стала заснавальнікам і старшынёй уласнай партыі — «Нацыянальнай лігі за дэмакратыю». Неўзабаве адбыўся новы ваенны пераварот, генерала-камуніста змяніў генерал-нацыяналіст, Аун Сан Су Чжы не дапусцілі да выбараў і ўпершыню змясцілі пад хатні арышт. Тым не менш новая хунта правяла выбары (першыя за 30 гадоў), «Ліга за дэмакратыю» набрала на іх 59 працэнтаў галасоў і атрымала 80 працэнтаў месцаў у парламенце. Пры такім раскладзе Аун павінна была стаць прэм'ер-міністрам. Ваенныя ўладу не аддалі, вынікі выбараў адмянілі, дачка генерала зноў была арыштаваная.

Яна была пад хатнім арыштам у 1991-м, калі яе сыны-падлеткі прымалі прысуджаную ёй Нобелеўскую прэмію. З 1995 па 2000 год, калі яна была на свабодзе, ваенныя асабліва імкнуліся выжыць яе з краіны. У 2002-м яе зноў вызвалілі, а праз год, пасля здзяйснення на яе ж замаху, зноў арыштавалі і таемна зняволілі ў турму, чатыры месяцы пра яе лёс нічога не было вядома. Выступаючы на першым пасля свайго вызвалення мітынгу, яна заклікала не да звяржэння антынароднага рэжыму, а да нацыянальнага прымірэння. Восенню 2015 года «Нацыянальная ліга за дэмакратыю», якую ўзначаліла 70-гадовая Аун Сан Су Чжы, заваявала большасць галасоў у абедзвюх палатах парламента М'янмы на першых у гісторыі краіны свабодных выбарах. Цяпер яна займае пасаду дзяржсаветніка, якая адпаведная прэм'ер-міністру, дазваляе працаваць ва ўсіх абласцях кіравання. Па сутнасці, яна ўплывае на ўсе рашэнні ў краіне. Як мяркуюць аналітыкі, Аун Сан Су Чжы вымушана быць жорсткай. «Дачка свайго народа, яна не можа заклікаць бірманцаў праявіць ласку і дазволіць мусульманам-рахінджа беспярэшкодна засяліць землі ў Аракане, — адзначыў «Коммерсанту» загадчык кафедры Маскоўскага гуманітарнага ўніверсітэта, дырэктар цэнтра Паўднёва-Усходняй Азіі, Аўстраліі і Акіяніі Інстытута ўсходазнаўства РАН Дзмітрый Масякоў. — Яна разумее межы свайго лібералізму і дзейнічае цалкам прагматычна — ва ўнісон і з ваеннымі, і з рознымі палітычнымі групамі. Яна вымушана ісці на пэўныя кампрамісы». Гэта і будзе вызначаць развіццё сітуацыі ў М'янме, якая ўзрушыла свет.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Калюжки, аг. Барсуки, дер. Калюга, дер. Белая Лужа, дер. Замлынье Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2. | Дата, время и место проведения аукциона | **16 октября 2017 года, в 15.00**<br>г. Жодино, пер. Молодежный, 3<br>Жодинский сельисполком, кабинет №1 |
| 3. | Продавец и его адрес | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | **Лот №1 —** земельный участок №4 площадью 0,1491 га с кадастровым номером 624881707601000247 в деревне Калюжки.<br>**Лот №2 —** земельный участок №16 площадью 0,15 га с кадастровым номером 624881701101000434 в агрогородке Барсуки.<br>**Лот №3 —** земельный участок площадью 0,1498 га с кадастровым номером 624881706601000060 в деревне Замлынье.<br>**Лот №4 —** земельный участок №1 площадью 0,1360 га с кадастровым номером 624881707501000109 в деревне Калюга.<br>**Лот №5 —** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная |
| 5. | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6. | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7. | Начальная цена продажи | **Лот №1** — 9 000,00 рублей<br>**Лот №2** — 16 000,00 рублей<br>**Лот №3** — 3 000,00 рублей<br>**Лот №4** — 5 500,00 рублей<br>**Лот №5** — 4 000,00 рублей |
| 8. | Условия проведения аукциона | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9. | Наличие инженерной инфраструктуры | **Лот №1 (возможность газоснабжения)**<br>**Лот №2 (электроснабжение, газоснабжение)** |
| 10. | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ №616 в филиале 612 ОАО «АСБ Беларусбанк»<br>г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25 «А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11. | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | Каждую среду в 15.00 |
| 12. | Окончательный срок приема заявлений | **10 октября 2017 года до 17.00** |
| 13. | Контактный телефон | 8 01775 35-449, 8 01775 37-174, 8 01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения, подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: земельный участок в дер. Калюжки — 1472,14 рублей, и земельный участок в аг. Барсуки — 1 601,09 рублей, земельный участок в дер. Замлынье — 1 657,92 рублей, земельный участок в дер. Калюга — 1 652,57 рублей и земельный участок в дер. Белая Лужа — 1 444,83 рублей (без учета стоимости информационного сообщения).**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо)

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

**Предмет аукциона**

Лот №1. **Административное помещение**, общ. пл. 49,2 кв. м инв. №500/D-7077024, адрес: **г. Минск**, ул. Мельникайте, д. 2, пом. 9. Начальная цена с НДС 20% — **121 177,04** бел. руб.

Лот №2. **Складское помещение**, общ. пл. 227,4 кв. м, инв. №500/D-1003747, адрес: **г. Минск,** ул. Могилевская, д. 5-2. Начальная цена с НДС 20% — **220 454,77** бел. руб.

Лот №3. **Складское помещение**, общ.пл. 80,1 кв. м, инв. №500/D-708033712, адрес: **г. Минск,** ул. Могилевская, д. 5-11. Начальная цена с НДС 20% — **77 653,73** бел. руб.

Лот №4. **68/125 долей складского помещения**, общ. пл. 15 кв. м, инв. №500/D-708033713, адрес: **г. Минск,** ул. Могилевская, д. 5-12. Начальная цена с НДС 20% — **7 957,99** бел. руб.

Лот №5. **68/125 долей складского помещения**, общ. пл. 7,3 кв. м, инв. №500/D-708033714, адрес: **г. Минск,** ул. Могилевская, д. 5-13. Начальная цена с НДС 20% — **3 789,19** бел. руб.

Лот №6. **Помещение финансового назначения**, общ.пл. 123,5 кв. м, инв. №200/D-157820, адрес: **г. Витебск,** ул. Воинов-Интернационалистов, 23-76. **Обременения:** аренда. Начальная цена с НДС 20% — **180 582,77** бел. руб.

Лот №7. **3/10 долей административно-бытового помещения**, общ. пл. 314 кв. м, инв. №200/D-88327, адрес: **г. Витебск,** пр-т Фрунзе, 108. Начальная цена с НДС 20% — **44 694,29** бел. руб.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) — BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи по лотам: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

100% от стоимости реализации объекта недвижимого имущества оплачивается в течение 15 рабочий дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.08.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **10.10.2017 г.** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **06.10.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 183-69-71.<br>Email: auction@cpo.by |

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| **Наименование** | **Характеристика** |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. №401/С-31767 (назначение — здание специализированное для образования и воспитания, наименование – детский сад), площадью 1610,8 кв. м, расположенное по адресу г. Скидель, ул. Первомайская, 27 |
